

ЭКЗАМЕН НА «АЎТАМАЦЕ» 4



ЧАС ЮАНЯ 12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 САКАВІКА 2022 г. СУБОТА № 54 (29676)


КОРАТКА

- У Беларусі ў студзені — лютым пабудавалі 7,2 тыс. кватэр.
- Першы блок БелАЭС выпрацаваў 8,2 млрд кВт·гадз электраэнергіі.
- Мінфін перагледзіць дэфіцыт бюджэту на 2022 год.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга РУСІНОВІЧ, дырэктар дэпартамента па прадпрымальніцтве Міністэрства эканомікі:**

*«Рабоце па імпартазамяшчэнні важна надаць дадатковы імпульс, сінхранізуючы інтарэсы галін і рэгіёнаў, больш актыўна ўключаць у яе малы і сярэдні бізнес. Тым самым мы змаглі б сфарміраваць новыя, яшчэ больш устойлівыя лагістычныя схемы паставак сыравіны, матэрыялаў і камплектуючых на валаўтваральныя прадпрыемствы краіны, знізіўшы вастрыню пытанняў, звязаных з бесперабойным выпускам прадукцыі. Таксама, распрацоўваючы пакет дакументаў па падтрымцы эканомікі, мы будзем слухаць бізнес, улічваць яго інтарэсы і запатрабаванні. Для гэтага на базе агенцтва па інвестыцыях дзейнічае аператыўны кантактны цэнтр. Там можна атрымаць кансультацыі, якія дапамогуць дакладна сарыентавацца ў абстаноўцы. Праз гэты канал зваротнай сувязі ўрад будзе атрымліваць звесткі аб праблемах, якія ўзнікаюць у сувязі з санкцыйнымі абмежаваннямі, і аператыўна рэагаваць на гэтыя сігналы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «СЁННЯ ТРЭБА ПРАЗ ЛЮБЫЯ ЦЯЖКАСЦІ, СКЛАДАНАСЦІ, СЦІСНУЎШЫ ЗУБЫ, ВЫТРЫМАЦЬ ГЭТЫ І, МАГЧЫМА, НАСТУПНЫ ГОД»

## Падчас рабочай паездкі ў Глыбокае Прэзідэнт спытаў у адказных за рэарганізацыю АПК Віцебшчыны

**Кіраўнік дзяржавы наведаў ААТ «Глыбоцкі малочнакансервавы камбінат» і азнаёміўся з работай гэтага прадпрыемства. Супрацоўнікі прадпрыемства расказалі Прэзідэнту пра метады і тэхналогіі перапрацоўкі сыравіны.**

Асобна пагаварылі і пра малочную сыроватку, якую раней не перапрацоўвалі, а проста ўтылізавалі. Але гэта запатрабаваны прадукт. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што такога быць не павінна. Асабліва гэта актуальна на фоне санкцыйнага ціску і росту цэн на прадукты харчавання ў свеце. «Мы ўсё гэта павінны перапрацаваць. Нам цяпер шанц — на гэтым узняць сельскую гаспадарку. Расіяне цяпер з задавальненнем бяруць усе тавары», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на пытаннях працоўнай дысцыпліны на прадпрыемстве. «Прыйшоў працаваць — давай вынік», — падкрэсліў ён.

СТАР. 2



Фота БелТА.

Тэорыя і практыка

# Педагогіка: поўнае паглыбленне ў прафесію

## Чаму «знаёмства» са школай нельга адкладваць да апошняга курса?

**Якім павінен быць сучасны настаўнік? Гэта цікавы, харызматычны, поўны творчай энергіі чалавек, які выхоўвае такіх жа актыўных, неабыякавых і разважлівых людзей. Ён павінен быць адначасова прадметнікам, мудрым псіхолагам, таленавітым выхавальнікам, справядлівым суддзёй, арганізатарам, даследчыкам, прамоўцам, выдатным імправізатарам і акцёрам у адной асобе. Безумоўна, калі запытацца ў вучняў пра ідэальнага настаўніка, яны назавуць яшчэ шмат якасцяў, якімі той павінен, на іх думку, валодаць: справядлівасць, спагада, талерантнасць, мудрасць, дабрыня, крэатыўнасць, мабільнасць, аптымізм... Для іх чалавечыя якасці, магчыма, будуць нават пераважаць над прафесійнымі. Узнікае заканамернае пытанне: а ці можна выпусціць з вышэйшай навучальнай установы ТАКІХ педагогаў? Або стаць сапраўдным настаўнікам можна толькі пасля многіх гадоў працы ў школе? Рэктар Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта Аляксандр ЖУК упэўнены, што да гэтага трэба імкнуцца.**

### Навучанне «на перадавой»

Ужо не першы год на базе БДПУ дзейнічаюць вучэбна-навукова-інавацыйны кластар і Каардынацыйны савет па пытаннях бесперапыннай педагагічнай адукацыі. Агульнымі намаганнямі быў распрацаваны прафесійны стандарт педагога, у якім знайшлі адлюстраванне самыя актуальныя патрабаванні. На падставе гэтага дакумента абнаўляюцца адукацыйныя стандарты па ўсіх педагагічных спецыяльнасцях, мадэрнізуюцца структура і змест тыпавых вучэбных планаў і праграм педагагічнай адукацыі на ўсіх узроўнях.

СТАР. 7

Актуальна

# СПАКУСА ДЛЯ ПРАЙДЗІСВЕТАЎ

## Як усвядоміць каштоўнасць персанальных даных і забяспечыць іх абарону, раіліся на семінары ў Брэсце

**Няма ўжо, відаць, такога чалавека — трымальніка банкаўскай карткі, які б не сутыкнуўся са спробай махляроў нажыцца. Думаю, і вам тэлефанавалі невядомыя, рэкамендаваліся супрацоўнікамі банка, затым неслі лухту пра пагрозу спісання вашых сродкаў у спадзяванні з вашай жа дапамогай гэтымі сродкамі завалодаць. Часам яны прадстаўляюцца работнікамі міліцыі, прапаноўваюць паўдзельнічаць у выкрыцці махляроў альбо несумленных банкіраў, узяць крэдыт ды паведаміць яго рэквізіты. А што дае ім падставу для такіх званкоў?**

Нумары тэлефонаў, імёны, часам імёны па бацьку, прозвішчы. То-бок нашы персанальныя даныя. Недзе ж яны іх бяруць. Думаю, нярэдка ім дапамагаюць сацыяльныя сеткі. Памятаеце, як з пачатку ваенных дзеянняў ва Украіне некаторыя маці нашых салдат тэрміновай службы атрымалі званкі з паведамленнем аб гібелі сына альбо яго палоне? Міністэрства абароны краіны ў тыя дні аператыўна абвяргала гэтыя звесткі. А я тады разважала, адкуль у зламыснікаў могуць быць даныя менавіта салдацкіх маці. Не званілі ж яны тым жанчынам, напрыклад, якія маюць адных дачок. Трапілі дакладна па адрасах. І прыходжу да высновы, што звесткі маглі браць з сацсетак. Скажам, паедуць нашы мамкі на прысягу, потым выкідваюць на свае віртуальныя старонкі фота з сынамі ў форме, з каментарыямі, з імёнамі. Тэлефон высвеціць для ўмельца — справа тэхнікі — вось вам і званок. Зараз не гавару пра маральнае аблічча аўтараў такіх званкоў. Тэма іншая.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «СЁННЯ ТРЭБА ПРАЗ ЛЮБЫЯ ЦЯЖКАСЦІ, СКЛАДАНАСЦІ, СЦІСНУЎШЫ ЗУБЫ, ВЫТРЫМАЦЬ ГЭТЫ І, МАГЧЫМА, НАСТУПНЫ ГОД»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пасля Прэзідэнт накіраваўся на мясакамбінат. Тут галоўнай тэмай размовы сталі сыравінныя зоны. Магутнасці на прадпрыемствы ёсць і неабходна забяспечыць іх эфектыўную загрузку, правільна задзейнічаць працоўныя рэсурсы. У прыватнасці, размова ішла аб магчымым аб'яднанні Глыбоцкага мясакамбіната з аналагічным прадпрыемствам у Мёрах. Беларускі лідар даручыў прапрацаваць гэта пытанне. Па яго словах, аб'яднаць не праблема, але найперш важны вынік. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што дадаткова вывучыць гэты аспект падчас запланаванага візіту на металапракатны завод у Мёрах.

## «Прыйшоў час спытаць за вынік»

Усе пытанні і праблемы, а таксама перспектывы развіцця аграпрамысловага комплексу Віцебшчыны былі вынесены на парадак дня нарады з удзелам Прэзідэнта і кіраўніцтва вобласці і галіновых падраздзяленняў. Аляксандр Лукашэнка заклікаў удзельнікаў нарады засяродзіцца на канкрэтных мерах і прапановах па рашэнні праблем.

«Два гады таму па прапанове з месцаў я падтрымаў ініцыятыву па стварэнні ў Віцебскай вобласці сямі інтэграцыйных структур. Тады вы клятвенна запэўнівалі мяне і ўсю краіну, што гэта адзіны спосаб, які зможа вывесці вас на добры ўзровень жыцця. Вы ўсё гэта памятаеце, таму сёння надышоў час, як і абяцаў, спачатку на захадзе, а потым і на ўсходзе разгледзець работу эфектыўнасці аграпрамысловых аб'яднанняў вобласці», — сказаў Прэзідэнт у пачатку нарады.

Ён акцэнтаваў увагу на тым, што прайшло два гады з моманту карэкціроўкі адпаведных дакументаў. У прыватнасці, гаворка ідзе пра Указ № 70, які быў прыняты 25 лютага 2020 года. «Абсалютна ўсё, аб чым прасіў Віцебскі аблвыканкам, дзяржава выканала. І нават больш. Даравалі, спісалі, далі адтэрміноўкі, растэрміноўкі, адкрылі спецыяльныя рахункі, гасім за вас працэнты і да таго падобнае. Прыйшоў час спытаць за вынік. Абстаноўка ў нашым рэгіёне няпростая. Вы сур'ёзна павінны краіне і бюджэту. І павінны жалезна вяртаць сродкі, укладзеныя ў вашую падтрымку», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Прэзідэнта, вывучэнне аналітычных матэрыялаў урада, аблвыканкама, кантралюючых і наглядных органаў паказвае: на неабходныя параметры развіцця аграаб'яднанні пакуль не выйшлі. Ні ў вытворчай частцы: ураджай, кармы, мяса, малако, загрузка вытворчасцяў. Ні, самае галоўнае, у эканамічнай і фінансавай частках: прыбытак, рэнтабельнасць, экспарт, абслугоўванне даўгоў.

«Лічу такое становішча крайне ненармальным, што ў цэлым па ўсіх аб'яднаннях за мінулы год атрымана страта ад рэалізацыі. Палова арганізацый працуе з адмоўнай рэнтабельнасцю. Выраслі пратэрмінаваныя даўгі, квітнеюць пасрэднікі і схемы выдачы шматгадовых авансаў з боку перапрацоўшчыкаў на карысць неэфектыўных гаспадарак. Як мяне інфармуюць, ёсць і факты затрымак заробку простым работнікам. Аб гэтым я папярэджваў вас асобна», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар таксама звярнуў увагу, што Камітэт дзяржкантролю дакладвае аб вялікай цякучасці кадраў у АПК Віцебшчыны. Палова кіраўнікоў мае стаж працы менш за тры гады. У аб'яднаннях не хапае дзясяткаў заатэхнікаў, аграномаў, ветурачоў і іншых патрэбных спецыялістаў.

«А мы ж дамаўляліся, што пры аб'яднанні будуць створаны брыгады адпаведных спецыялістаў, асабліва ветэрынарных урачоў, і яны будуць абслугоўваць прадпрыемствы, якія ўваходзяць у ваша інтэграцыйнае аб'яднанне. На мінулай нарадзе я асабіста папярэджваў і галіновага міністра, і губернатара за кадравы бок пытання. Не вырашым кадравае пытанне, пытанне з вытворчай дысцыплінай — ніякіх праблем не вырашым», — заявіў Прэзідэнт.

Удзельнікі нарады дэталёва разгледзелі сітуацыю, якая склалася ў аграпрамысловых аб'яднаннях вобласці. У прыватнасці, засяродзіліся на трох арганізацыйных пытаннях: вертыкаль кіравання, роля Віцебскага канцэрна «Мяса-малочныя прадукты», удзел Мінсельгасхарча. І галоўным пытаннем Прэзідэнт назваў даручэнне старшыням райвыканкамаў па персанальнай адказнасці за два-тры найбольш слабыя сельгаспрадпрыемствы. На парадак дня былі вынесены і іншыя пытанні.

«Што з выканальніцкай дысцыплінай у рэалізацыі тых планаў і праграм, якія былі распрацаваны і зацверджаны самім аблвыканкамам і ўрадам? Прэзідэнт у гэту работу не ўмешваўся і даў вам усе паўнамоцтвы, якія вы прасілі. Вы іх атрымалі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе Прэзідэнту было дакладана, што за два гады пасля прыняцця ўказа аб стварэнні інтэграцыйных аб'яднанняў пэўныя вынікі ёсць: удалося знізіць пазыковую нагрузку, вырашаюцца пытанні матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання, разгорнута маштабнае будаўніцтва новых аб'ектаў на фермах (некаторыя яшчэ ў стадыі завяршэння або не ўкамплектаваны жывёлай), прымаецца шэраг крокаў для вырашэння кадравых праблем. Тым не менш праблемныя пытанні шмат у чым застаюцца. Перш за ўсё пакуль няма належнай фінансавай аддачы, магутнасці шэрагу прадпрыемстваў недазагружаны.

## «Вёсцы трэба рухацца»

«Не дай бог сёлета не будзе ўраджаю. Вы хочаце нейкіх дадатковых правоў, паўнамоцтваў, — бярыце любыя. Як той Ельцын гаварыў: колькі праглыняце, пацягняце, столькі і бярыце», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што старшыня райвыканкама, губернатар, дырэктар прадпрыемства павінны пастаянна трымаць на кантролі ўсё, што адбываецца ў сельскай гаспадарцы.

«Цяпер свет ламаецца на кале на, ідзе перадзел свету, а мы тут разважаем. Трэба працаваць, калі хочаце выжыць і выратаваць краіну. Без «вёскі» Віцебск не выжыве, але «вёсцы» трэба рухацца. Ёсць шмат форм для працы. Самае галоўнае — дайце кіраўнікам права прымаць рашэнні. У тым ліку і кадравыя. Цяпер момант такі. Момант цяжкі, але ў той жа час шыкоўны момант. Расія адкрыта. Нам адкрываецца цудоўная магчымасць. І грошы добрыя. Нас расійскі рубель што, не задавальняе? Задавальняе. Мы можам паліва купіць, сыравіну, рэсурсы. Для сельскай гаспадаркі лепшага часу не будзе», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Таксама беларускі лідар выказаў упэўненасць, што беларуская прадукцыя будзе запатрабаваная і ва Украіне. Асабліва калі там скончыцца канфлікт. «Там жа ўсё разбіта. Яны ці пасеюць яшчэ сёлета. Таксама трэба людзей карміць — 40 мільёнаў. Мы і так на $7 млрд там гандлявалі. Прадавай, калі ласка. А мы ў Віцебску нешта чакаем: прыедзе зараз Прэзідэнт, прывязе «навагодняга падарунка» ў мяшку», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што сістэма інтэграцыйных аб'яднанняў здольная існаваць у краіне. Тым больш гэта не навінка. Аб'яднанне вытворчасцяў сыравіны, перапрацоўкі і гандлю прадукцыяй, як правіла, прыносіць чаканы станоўчы фінансавы вынік. Аб'яднанне вытворчасцяў сыравіны і перапрацоўкі Аляксандр Лукашэнка назваў першым крокам. Варта зрабіць і другі — падключыць гандаль. Тады будзе нармальная сістэма, якая дасць вынік.

Акрамя таго, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, дадатковыя магчымасці для беларускай сельскай гаспадаркі адкрываюць і заходнія санкцыі. «Момант такі: з аднаго боку, найцяжэйшая сітуацыя. Душыць будуць нас разам з Расіяй пастаянна. Вы ж бачыце, што яны нас уключаюць у спісы, каб Расія праз Беларусь не абышла санкцыі, гэта значыць, за кампанію. Але мы ж разумеем, што ім трэба загубіць нас, давесці да ўзроўню Украіны і назаўжды разабрацца з гэтым», — сказаў ён.

Але з іншага боку, заўважыў Прэзідэнт, для аграрыяў і вытворцаў сельгастэхнікі санкцыі — гэта новыя магчымасці ўмацавацца на рынках, асабліва на расійскім. І калі беларускія аграрыі не скарыстаюцца гэтым шанцам, сельская гаспадарка з кален не ўстане. «Таму сёння трэба праз любыя цяжкасці, складанасці, сціснуўшы зубы, вытрымаць гэты і, магчыма, наступны год. І мы перастроімся і будзем працаваць нармальна. Але вы павінны для таго, каб падняцца з кален, атрымаць прадукцыю і прадаць», — канстатаваў ён.

У сувязі з гэтым беларускі лідар зрабіў акцэнт на неабходнасці трывалага эканамічнага падмурку для развіцця. І самае галоўнае — асабістай ініцыятывы кожнага.

«Гультайства недапушчальна. Нават калі рыдлёўкай трэба зямлю перакапаць. Вы ж адчуваеце, якая сітуацыя. Мы хочам быць незалежнымі. А рухацца для той незалежнасці нізхто не хоча: ад членаў урада да даярак. Таму, калі вы выбралі гэтую незалежнасць, давайце ўкалваць. Патрэбны малако і мяса. У вас ёсць вытворчыя магутнасці для пераапрацоўкі — загрузіце іх. Тады ў вас будуць грошы, і я да вас прэтэнзій мець не буду. Пачынайце з кадраў, навядзіце парадак», — паставіў задачу Прэзідэнт.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Глыбокае.*

### ❍ У тэму

Пасля нарады з Прэзідэнтам удзельнікі расказалі журналістам, аб чым канкрэтна ішла гаворка.

**Міністр сельскай гаспадаркі Ігар БРЫЛО** расказаў, што кіраўнік дзяржавы паставіў жорсткія задачы, якія неабходна вырашыць, каб інтэграцыйная структура працавала эфектыўна.

«Найперш развіваць жывёлагадоўлю. Нам трэба папоўніць аб'ём на перапрацоўчых прадпрыемствах. Вядзецца маштабная будоўля па ўсіх інтэграцыйных структурах. Можа быць, яны не ўсе ўкамплектаваныя, але рана ці позна будзе ўкамплектавана і дасць свае вынікі», — падкрэсліў міністр.

Ігар Брыло заўважыў, што ў краіне ёсць яркія прыклады інтэграцыйных структур у сельскай гаспадарцы, напрыклад агракамбінаты «Дзяржынскі» і «Сноў». Але яны паэтапна фарміраваліся некалькі гадоў, а на Віцебшчыне такія структуры ўзніклі ў адзін момант.

«Калі мы раскрыем рэзервы кожнага прадпрыемства, якое ўваходзіць у гэтую структуру, фінансавы стан можам паправіць. Гэтая структура дзеяздольная. Але патрэбны і добрыя кіраўнікі з глыбокім разуменнем пытанняў, разуменнем сельскай гаспадаркі. Спадзяёмся, што ўсё стане на свае месцы і гэтыя структуры выйдуць на станоўчую дынаміку росту», — расказаў міністр.

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН** расказаў, што ўдзельнікі нарады сышліся на меркаванні, што ў рэгіёне могуць развівацца і паспяхова працаваць сельскагаспадарчыя інтэграцыйныя структуры.

«Мы яшчэ два гады таму, калі прымалі ўказ, вызначыліся, што інтэграцыйным структурам быць. Але ў якім выглядзе ім быць і куды далей рухацца — гэта пастаянна патрабуе карэкціроўкі. Усё навокал мяняецца, і сама работа структур агаляе пэўныя праблемы», — сказаў ён.

Падводзячы вынікі нарады, Аляксандр Субоцін адзначыў, што па нейкіх пытаннях спатрэбіцца карэкціроўка палажэнняў прэзідэнцкага ўказа. Частку пытанняў можна вырашыць іншымі спосабамі.

«Але як вынік. Задзел зроблены, і мы канстатуем, што ўкладзеныя інвестыцыі яшчэ не пачалі прыносіць нам назад даходы. Таму наша першасная задача — запусціць тое, што зроблена, каб яно пачало працаваць. Тады гэты механізм пачне сам сябе карміць і развівацца», — рэзюмаваў старшыня аблвыканкама.

# «Людзі актыўна ідуць у Беларусь»

**У чацвер Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю японскаму тэлеканалу TBS. Працягваем публікацыю найбольш цікавых фрагментаў з той размовы ў Палацы Незалежнасці.**

Як паведамляе БелТА, Аляксандр Лукашэнка расказаў журналістам, што за ўвесь перыяд канфлікту на Украіне з 2014 года ў Беларусь прыбыло каля 200 тысяч украінцаў. Некалькі тысяч прыехалі пасля новай фазы канфлікту сёлета ў лютым.

«І сваякі, і людзі проста галодныя ратуюцца ад гэтага і прыбылі да нас. Усяго за ўвесь перыяд канфлікту з 2014 года каля 200 тысяч прыбыло ў Беларусь. Хтосьці лічыць 170—180 тысяч, хтосьці — 200 тысяч. Але ў гэтых межах. Адзінкі пасля гэтага з'ехалі. Цяпер назад вярнуліся», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён дадаў, што Беларусь — адзіная краіна, дзе прэзідэнцкім указам украінцы атрымалі такія ж правы, як беларусы. «Ідзе зараз у Беларусь менш людзей, таму што, каб трапіць у Беларусь, трэба прайсці праз пазіцыі расійскіх войскаў. Гэта стрымлівае людзей з Кіева, іншых населеных пунктаў. А тыя ўжо гарады, якія знаходзяцца ў тыле расійскіх войскаў, — Чарнігаў, іншыя пасёлкі і раённыя цэнтры, — адтуль людзі актыўна ідуць у Беларусь», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

### ❍ Дарэчы

Учора Прэзідэнт падпісаў Указ «Аб прыёме ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь». У адпаведнасці з ім беларускае грамадзянства атрымалі 428 чалавек. З іх 418 — грамадзяне Украіны, у тым ліку 103 непаўналетнія. У пераважнай большасці гэта жыхары Данецкай і Луганскай абласцей. Усяго са жніўня 2021 года кіраўніком дзяржавы прыняты ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь 1494 украінцы. Пры гэтым падраздзяленнямі па грамадзянстве і міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь у рэгістрацыйным парадку дадзена беларускае грамадзянства 1579 грамадзянам Украіны. Такім чынам, за названы перыяд сталі нашымі грамадзянамі 3073 украінцы.

### ❍ У тэму

Органы ўнутраных спраў, працягваючы выконваць даручэнне Прэзідэнта, па-ранейшаму прымаюць хадайніцтвы ад грамадзян Украіны, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і хадайнічаюць аб набыцці грамадзянства на падставе пяцігадовага тэрміну пражывання і рашэння Прэзідэнта, расказаў БелТА **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС, палкоўнік міліцыі Аляксей БЯГУН.**

«І лагічным завяршэннем разгляду хадайніцтваў было падпісанне адпаведнага ўказа Прэзідэнта, які задаволіў хадайніцтвы ўсіх грамадзян Украіны і прыняў іх у грамадзянства Рэспублікі Беларусь», — расказаў ён.

Паводле Аляксея Бегуна, колькасць грамадзян Украіны, якія маюць намер набыць наша грамадзянства, дастаткова вялікая, і работа па выкананні даручэння Прэзідэнта аб аператыўным разглядзе матэрыялаў гэтай катэгорыі асоб працягваецца.

«Нягледзячы на пэўнае абвастрэнне палітычных адносін з Украінай, усе грамадзяне Украіны, якія падалі хадайніцтва аб набыцці грамадзянства Рэспублікі Беларусь, не змянілі свайго намеру», — адзначыў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС.

Акцэнты

# ЗАРОБКІ, АБНОЎЛЕНАЯ КАНСТЫТУЦЫЯ І ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ВАЙНА

**На гэтыя тэмы кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА пагутарыў з калектывам 120-й зенітна-ракетнай брыгады ў Баранавічах.**




Фота БелТА.

Ігар СЕРГЕЕНКА ў час наведвання Музея народнага адзінства ў СШ № 1 імя С. І. Грыцаўца ў Баранавічах.

## Пра сацыяльную нагрузку дзяржавы

Яе, заявіў Ігар Сергеенка, дзяржава нясе ў поўным аб'ёме. Для гэтага ў Беларусі дакладна выбудавана сямейная палітыка, сацыяльная абарона, умацавана сацыяльная інфраструктура, наладжана падтрымка беспрацоўных, павышаюцца заработныя платы бюджэтнікам і розным катэгорыям насельніцтва. Але, адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, ва ўмовах санкцый складана знаходзіць новыя нестандартныя рашэнні, рынкі збыту, шляхі набыцця камплектуючых і прадукцыі.

«Беларусы ўваходзяць у пяцёрку сусветных лідараў па вытворчасці і рэалізацыі малочнай прадукцыі. Разам з тым экспарт сельгаспрадукцыі вырас за год на 1 мільярд долараў, — падкрэсліў Ігар Сергеенка. — Усе гэтыя прыклады сведчаць аб тым, што рух ёсць, рух будзе і ўсе праграмы будуць рэалізоўвацца. Так, нешта ва ўмовах сённяшняга дня будзе карэкціравацца, тым больш што ёсць непрадбачаныя сур'ёзныя выдаткі. Напрыклад, звязаныя ў тым ліку з барацьбой з каранавіруснай інфекцыяй, хоць яна пайшла на спад».

У ходзе сустрэчы таксама гаварылі на розныя тэмы: чым сёння жыве краіна, аб сацыяльна-эканамічным развіцці, паляпшэнні ўзроўню жыцця, рызыках і пагрозах, канстытуцыйным удасканаленні, сітуацыі ва Украіне.

Па словах Ігара Сергеенкі, ён часта сустракаецца з рознымі калектывамі. У тым ліку і ў вайсковых часцях, каб непасрэдна на месцах даведацца, чым жыве армія, як праходзіць вайсковая служба ў салдат і афіцэраў, які ў іх настрой, умовы баявой падрыхтоўкі і адпачынку.

«Тое, што я ўбачыў у Баранавіцкім гарнізоне, стварае добрае ўражанне. Афіцэры і салдаты настроены на баявую работу. Звярнуў увагу, што служыць шмат жанчын. Гэта таксама выдатна, значыць, прэстыж ваеннай прафесіі ў краіне ёсць, ён не падае», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

## Маніфест беларускага народа

Такім чынам ахарактарызаваў Ігар Сергеенка ў размове з ваеннаслужачымі адноўленую Канстытуцыю краіны, па якой мы жывём ўжо некалькі дзён. «Карпатлівая работа над Асноўным Законам вялася на працягу года, адбылося сапраўды ўсенароднае абмеркаванне. Кожны чалавек меў права выказацца. Паступалі самыя розныя прапановы: па сутнасці, якія былі ўлічаны, у падтрымку, а таксама тыя, якія знойдуць адлюстраванне ў далейшай распрацоўцы заканадаўчай базы», — канстатаваў Ігар Сергеенка.

Як ён падкрэсліў, у Канстытуцыі адлюстраваны асноўныя напрамкі і палажэнні, якія датычацца правоў, свабод, абавязкаў грамадзян, палітычнай сістэмы, судаўладкавання, укаранення Усебеларускага народнага сходу. «У цэлым гэта Канстытуцыя будучага, заўтрашняга дня», — сказаў Ігар Сергеенка.

## У актыўнай фазе інфармацыйнай вайны

«Сёння дастаткова ў інфармацыйнай прасторы асвятляюцца падзеі на тэрыторыі Украіны. Усе нашы дзяржаўныя СМІ аб'ектыўна адлюстроўваюць тое, што адбываецца.

Аднак варта адзначыць, што ў гэтых хітрасплячэннях складана разабрацца людзям, асабліва недасведчаным: маса фэйкаў, льецца патокам дэзынфармацыя з розных каналаў. Мы знаходзімся ў актыўнай фазе інфармацыйнай вайны і аказаліся ўцягнуты ў яе нехаця. Адпаведна падаюцца і інтэрпрэтуюцца розныя падзеі. Адзін і той жа факт могуць паднесці зусім пад іншым ракурсам», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Сергеенка абверг адзін з нядаўніх фэйкаў. Паводле яго слоў, на мінулым тыдні ва ўкраінскіх СМІ з'явілася інфармацыя аб тым, што расійскі самалёт, які нібыта стартаваў з беларускай тэрыторыі, скінуў некалькі снарадаў на тэрыторыі Украіны, а на зваротным шляху — некалькі снарадаў на тэрыторыі Беларусі. «Гэта інфармацыя з'явілася ва ўкраінскіх СМІ, — растлумачыў ён. — Мы разабраліся на працягу некалькіх гадзін. Тут жа ў сродках масавай інфармацыі размясцілі аб'ектыўныя звесткі аб тым, што гэтага проста не было».

**Паводле БелТА.**

Прыемная навіна

# НЕ ТОЛЬКІ ХРАМ ВЕДАЎ, АЛЕ І КУЛЬТУРНА-САЦЫЯЛЬНЫ ЦЭНТР

**Жыхарам Маладзечна ў Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь мясцовыя і абласныя ўлады паднеслі важкі падарунак. У горадзе адкрылася пасля капітальнага рамонту Цэнтральная раённая бібліятэка імя Максіма Багдановіча. Рамонт старога будынка вёўся па меры паступлення сродкаў — з 2014 года.**

— Хочацца асабліва падкрэсліць, што такі цудоўны падарунак жыхары атрымалі дзякуючы падтрымцы Мінаблвыканкама, які аказваў значную дапамогу ў капітальным рамонце, — адзначыў **старшыня Маладзечанскага райвыканкама Юрый ГОРЛАЎ**. — Унікальны будынак упрыгожыць не толькі горад, раён, але і Мінскую вобласць. Скажу, што атрымаўся не проста аб'ект, а сацыякультурны цэнтр.

Ацаніць якасць рамонту і магчымасці бібліятэкі ды культурных устаноў, якія размясціліся тут, прыехаў **старшыня Мінаблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН.** Для яго была праведзена экскурсія.

На першым паверсе знаходзяцца падраздзяленні Маладзечанскага раённага Цэнтра рамёстваў.

— Тут месціцца выставачная зала, стол заказаў і пункт продажу сувенірнай прадукцыі. Людзі могуць, купіць або заказаць вырабы з саломы, лазы, ільну, скуры, бісеру і іншыя. Усе ахвотныя могуць прайсці майстар-клас і зрабіць падарунак блізкім, сябрам або сабе сваімі рукамі. Мы працуем з усімі ўзроставымі катэгорыямі грамадзян, — расказала **дырэктар раённага Цэнтра рамёстваў Ларыса СТУПІНА.**

У суседнім памяшканні — філіял дзіцячай школы мастацтваў, дзе хлопчыкі і дзяўчынкі будуць займацца выцінанкай, жывапісам, графікай.

Другі паверх цалкам адведзены пад бібліятэку. **Дырэктар Марыя СТАСЯЛОВІЧ** распавяла, што будынак быў узведзены ў 1950-х гадах мінулага стагоддзя. Бібліятэка за час свайго існавання прымала пачэсных гасцей — Івана Мележа, Максіма Танка. У 1993 годзе вырашана прысвоіць ёй імя Максіма Багдановіча, які два месяцы жыў у Ракуцёўшчыне, дзе была напісана «Зорка Венера». Штогод у ліпені тут праводзіцца паэтычны фестываль «Ракуцёўскае лета».

Па словах дырэктара, усяго на рамонт бібліятэкі пайшло больш за 2,6 мільёна рублёў. Цалкам заменены дах, падлога, уладкаваны вентыляцыйныя каналы, сеткі водазабеспячэння, праведзены сантэхнічныя і электрамантажныя работы, добраўпарадкавана тэрыторыя, створана безбар'ернае асяроддзе.

Дызайн, дарэчы, атрымаўся арыгінальны. У чытальнай зале замест доўгіх сталоў уладкаваны зоны з мяккімі канапамі і крэсламі. З адкрытых паліц можна ўзяць кнігу, пагартаць, пачытаць і паставіць яе на ранейшае месца. У цэнтры залы — спецыяльны закруглены стол, дзе зручна збірацца групай.

— Ёсць у бібліятэцы і фонд рэдкіх кніг, які налічвае 382 выданні, — падзялілася Марыя Стасяловіч. — Самае старэйшае выданне — Карамзіна — датаванае 1820 годам.

Насупраць дарослай размясцілася і дзіцячая бібліятэка сямейнага чытання «Верасок». Малыя прыйдуць сюды са сваімі бацькамі, якія змогуць пачытаць ім казку, пагуляць у спецыяльна створаным для забаў кутку. Афармлены таксама раздзелы для дзяцей сярэдняга і старэйшага школьных узростаў. Сучасныя кнігі не ўсім па кішэні, а тут можна скарыстацца імі бясплатна.

— Дадзеную бібліятэку сапраўды можна назваць культурным цэнтрам, і гэта не можа не радаваць. Плюс да таго вялікая колькасць дзяцей, дарослых, я ўпэўнены, будзе прыходзіць і рэалізоўваць свае творчыя магчымасці, — пагадзіўся Аляксандр Турчын. — У Мінскай вобласці мы не забываем культуру, шануем і беражом яе. Фактычна кожны год на Міншчыне адкрываюцца значныя аб'екты ў сферы культуры: музей у Чэрвені, сёлета з'явяцца новыя кінатэатр і школа мастацтваў у Стоўбцах.

«На мой погляд, без культуры ў чалавека няма будучага. Таму што культура — гэта сувязь з мінулым, нацыянальныя традыцыі, на якія мы абапіраемся. Ні ў якім разе нельга адсоўваць культуру на задні план, таму што многія нашы ўчынкі ў сталым узросце перасякаюцца з тым, што мы мелі ў мінулым. Наш менталітэт, наша культура — найважнейшыя рэчы, без якіх нельга абысціся», — рэзюмаваў Аляксандр Турчын.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## На канцэрце-мітынгу ў «Лужніках» выступіў Уладзімір Пуцін



**Прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін, выступаючы на канцэрце-мітынгу ў «Лужніках», заявіў, што галоўнай мэтай ваеннай спецаперацыі з'яўляецца спыненне генацыду насельніцтва Данбаса.**

Ён звярнуў увагу, што супраць жыхароў Данбаса, якія не пагадзіліся з «дзяржаўным пераваротам ва Украіне», былі арганізаваны карныя ваенныя аперацыі. Паводле слоў кіраўніка расійскай дзяржавы, гэтых людзей «пагрузілі ў блакаду, падвергнулі сістэматычным абстрэлам з гармат» і «ўдарам авіяцыі».

«Менавіта пазбавіць людзей ад гэтых пакут, ад гэтага генацыду і з'яўляецца асноўнай, галоўнай прычынай, заахвочвальным матывам і мэтай ваеннай аперацыі, якую мы пачалі ў Данбасе і ва Украіне. Менавіта ў гэтым мэта», — сказаў расійскі лідар.

Канцэрт-мітынг, прымеркаваны да гадавіны ўз'яднання Крыма і Севастопаля з Расіяй, прайшоў учора днём у маскоўскім спарткомплексе «Лужнікі». На ім прысутнічала больш за 200 тысяч чалавек. У праграме мерапрыемства таксама — выступленні артыстаў з РФ, Украіны і Данецкай Народнай Рэспублікі.

Дзень уз'яднання Крыма з Расіяй 18 сакавіка адзначалі па ўсёй Расіі.

## У ЕКА засумняваліся, што змогуць паляцець на Марс без Расіі раней за 2028 год

**Пасля адмовы Еўропы ад супрацоўніцтва з Расіяй па праекце ExoMars-2022 запуск місіі можа быць адкладзены як мінімум на шэсць гадоў. Пра гэта паведаміў навуковы кіраўнік ExoMars-2022 з боку Еўрапейскага касмічнага агенцтва Хорхе Ваго.**

«Калі мы не зможам адправіць місію ў цяперашняй канфігурацыі, я не бачу магчымасці запусціць яе да 2028 года», — сказаў Ваго.

Еўрапейскае касмічнае агенцтва ў праекце адказвала за распрацоўку марсахода Rosalind Franklin, «Раскосмас» — за ракету-носьбіт і пасадачную платформу «Казачок».

Хорхе Ваго адзначыў, што пабудова новага пасадачнага модуля займае каля шасці гадоў незалежна ад таго, ці знойдзе ЕКА новых партнёраў.

«Мы страцім некалькі гадоў, але паўторым наш пасадачны модуль, забяспечым яго ракетай-носьбітам «Ангара» і з новага стартавага комплексу касмадрома «Усходні» правядзём самастойна гэтую даследчую экспедыцыю», — пракаментаваў, у сваю чаргу, сітуацыю кіраўнік «Раскосмасу» Дзмітрый Рагозін.

## Рост цэн у Еўропе паставіў абсалютны рэкорд

**Інфляцыя ў зоне еўра ў лютым вырасла да 5,9 працэнта ў гадавым выражэнні, што стала абсалютным рэкордам з моманту паўнацэннага ўвядзення гэтай валюты ў 2002 годзе, гаворыцца на сайце Еўрастата.**

Арганізацыя звязвае такія паказчыкі з імклівым ростам цэн на энергарэсурсы ў Еўропе. У лютым цэны на іх узняліся на 3,12 працэнта. Самыя высокія паказчыкі па інфляцыі зарэгістраваны ў Літве (14 працэнтаў), Эстоніі (11,6 працэнта) і Чэхіі (10 працэнтаў).

Для параўнання — інфляцыя ў студзені была 5,1 працэнта. Гадавая інфляцыя ў Еўрапейскім саюзе склала 6,2 працэнта ў лютым у параўнанні з 5,6 працэнта ў студзені.

# ЭКЗАМЕН НА «АЎТАМАЦЕ»:

## аўташколы будуць працаваць па новых правілах

**З новага ў працэсе навучання будучых аўтааматараў можна адзначыць галоўнае: ужо у хуткім часе ў іх з'явіцца магчымасць вучыцца і здаваць экзамен на машыне толькі з аўтаматычнай каробкай перадач. «Механіка», якой многія чамусьці баяцца, будзе непатрэбна. Але ці стане прасцей у такім выпадку здаць выправаванне ў ДАІ?**

Папраўкі ў закон аб дарожным руху пачнуць дзейнічаць з 22 верасня 2022 года. З навацый: будуць выдаваць міжнародныя правы па Канвенцыі аб дарожным руху 1968 года. Пры гэтым грамадзяне РФ змогуць кіраваць транспартнымі сродкамі ў Беларусі, карыстаючыся сваімі нацыянальнымі дакументамі.

Змяненняў шмат і іншых. Але ўсё ж адно з самых доўгачаканых і галоўных — магчымасць праходзіць навучанне і атрымліваць правы на кіраванне машынай з аўтаматычнай каробкай перадач (АКПП).

Варта разумець, што правы на АКПП будуць адрозніваецца ад тых, хто атрымае, вывучыўшыся на механічным варыянце. Здаваць не правы на «аўтамаце» некаму, можа, і сапраўды лягчэй, але трэба мець на ўвазе, што калі пачынаючы вадзіцель сядзе з імі за руль аўтамабіля з МКПП, гэта будзе прыраўноўвацца да язды без пасведчання. У сваю чаргу, атрымаўшы правы на «механіцы», кіроўца будзе мець права кіраваць машынай з любой каробкай перадач.

### ЗДАЦЬ НА «АЎТАМАЦЕ», АЛЕ ЕЗДЗІЦЬ НА «МЕХАНІЦЫ»?

Раней навучацца ў аўташколе і здаваць экзамен можна было толькі на аўто з «механікай», прычым нават калі на ёй многія зусім і не збіраліся ездзіць.

Цяпер жа, калі курсант здае практыку на машыне з АКПП і экзамен у школе і ДАІ, то і ездзіць яму можна будзе толькі на «аўтамаце» — правы будуць з такой адзнакай.

І яшчэ: калі з такімі правамі кіроўца сядзе за машыну з «механікай», то супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі будуць лічыць яго, на жаль, самым сапраўдным бяспраўнікам. За першае парушэнне такі «бяспраўнік» атрымае штраф у 20 базавых (з 1 студзеня 2022 года БВ складае 32 рублі). За паўторнае парушэнне яму пагражае да 50 базавых ці адміністрацыйны арышт. Калі кіроўца з правамі на АКПП сядзе за руль аўто з «механікай» трэці раз, яго чакае наогул «крыміналка».

Зразумела, што той, хто атрымаў правы на машыну з «механікай», зможа ездзіць як на МКПП, так і АКПП (як і раней).

### НОВЫЯ ГРУПЫ Ў АЎТАШКОЛАХ

Мы наведаліся ў некаторыя аўташколы і высветлілі, ці ёсць ужо набор кіроўцаў для навучання на «аўтамаце».

У аўташколе «Тваё правілы» такога набору, на жаль, пакуль што няма. Гэта абсалютна зразумела, сказалі нам: навошта вучаць будучых кіроўцаў па новых правілах, пакуль яны яшчэ не дзейнічаюць. Кіраўнікі сталічных аўташкол тлумачаць: пакуль яшчэ няма спецыяльных праграм, з дапамогай якіх можна было б вучыцца і здаваць экзамены на «аўтамаце». Праграмы, як і набор, чакаюцца толькі ў верасні.

Важна разумець, што ў ДАІ павінны яшчэ патлумачыць усе нюансы навучання будучых кіроўцаў па новых правілах. На сёння мала што вядома.

Трэба адзначыць, што навучанне на АКПП будзе даражэйшае з-за больш дарагога абслугоўвання аўтамабіля. Гэта не выключае таго, што давядзецца змяніць кошт на атрыманне правоў катэгорыі «В» з улікам паліва і вылучэння машыны аўто ў ДАІ.

### ЦІ АДМЕНЯЦЬ ЭСТАКАДУ?

Незразумела і тое, як кіроўцы будуць здаваць практыку ў Дзяржаўтаінспекцыі. Напрыклад, ці варта правяраць эстакаду на аўто з «аўтаматам»? У гэтым амаль няма сэнсу, упэўнены прадстаўнікі аўташкол.

Што датычыцца аўтапарка, не ўсе прадпрыемствы па аказанні гэтых паслуг, аказалася, маюць тэхніку з АКПП. Таму цяпер для многіх аўташкол галоўная задача — папоўніць парк аўтамабіляў з АКПП.

Дзяржаўтаінспекцыя краіны пакуль не дае ўсіх падрабязнасцяў па новых праграмах, але абяцае гэта зрабіць у хуткім часе. Цяпер той момант, калі трэба адладзіць усе працэсы, удакладнілі там.

### «КАРОБКА» ДЛЯ ГУРМАНАЎ

**Кіраўнік Цэнтра контраварыйнай падрыхтоўкі Сяргей АЎЧЫННІКАЎ** адзначыў, што навоўвядзенні па іспытах і правах на АКПП доўгачаканыя ў Беларусі, прымаць трэба было іх яшчэ раней.

«Гэта даўно трэба было зрабіць. Аўтамабілі, якія цяпер выпускаюць на МКПП, робіцца для «гурманаў», альбо гэта старыя мадэлі аўто. Таму мы становімся карыстальнікамі аўтамабіляў без неабходнасці ў іх разбірацца. Напрыклад, мы ж не задаёмся пытаннем, як уладкаваны камп'ютар. Нам гэта не трэба, калі што — нясём тэхніку ў рамонт. Гэтак жа і з аўтамабілямі: не ўсім абавязкова ведаць, якое ў яго начынне, не ўсе любяць гэтыя складанасці, мы хочам карыстацца тэхнікай, каб ад гэтага былі карысць і камфорт», — расказвае Сяргей Аўчыннікаў.

Паводле яго слоў, няма сэнсу ўскладняць жыццё. Не трэба людзей прымушаць вывучаць «вантробы» машыны, якія, як кажуць, ім абсалютна нецікавыя.

### «МЕХАНІКА» ЛЕПШАЯ ЗА «АЎТАМАТ»?

Ён тлумачыць, што кіраванне аўто з «механікай» патрабуе дадатковых маніпуляцый. І часам няўменне кіраваць такім тыпам транспарту можа прывесці да аварыйнай абстаноўкі на дарогах.

«У нас тры педалі ў машыне і дзве нагі — увогуле, шматзадачнасць. Але цяпер час, калі ўсё спрашчаецца. Ужо ствараюцца аўтамабілі на аўтапілоце, калі нават на педалі націскаць не трэба. Толькі руль папраўляй», — кажа Аўчыннікаў.

Хоць, вядома, у «механікі» ёсць свае перавагі. Машына з механічнай каробкай перадач лепш паводзіць сябе на бездаражы. Таксама «механіку» прасцей запусціць, як кажуць, са штурхача, а для «аўтамата» ў такой сітуацыі выклікайце эвакуатар. І, самае галоўнае, надзейнасць ручной каробкі перадач. Дарагое абслугоўванне ёй не трэба на працягу ўсяго тэрміну службы.

«Цяпер у людзей ёсць магчымасць выбару. Напрыклад, жанчына адвозіць і прывозіць дзяцей са школы — навошта ёй «механіка»? Яна ніколі ёй не будзе карыстацца. А калі ты хочаш развівацца, неяк паляпшаць сваё майстэрства кіравання, то можаш пасля здаць і на «механіку», таму што гэта больш складана. І калі ў цябе ёсць правы на кіраванне транспартам з МКПП, то і АКПП можна кіраваць — гэта лагічна.

### «АЎТАМАТ» — УЖО НЕ РАСКОША

Трэба ўлічваць і той факт, што з кожным годам усё больш вытворцаў аўто адмаўляецца ад вытворчасці машын з механічнай каробкай пераключэння перадач.

«Аўтамат» перастаў быць спадарожнікам прэміяльных машын. У Беларусі таксама расце колькасць аўто з АКПП, пра гэта сведчаць справаздачнасці па продажах у дылераў.

Так, адзін папулярны ў краіне дылер у афіцыйнай справаздачнасці паказаў, што за пяць гадоў амаль у тры разы нарасцілі продажы ў Беларусі аўто з АКПП. Калі ў 2015 годзе аб'ём продажаў такіх машын складаў парадку 18 %, то ў 2021 годзе гэты паказчык склаў амаль 50 %.

### НЕ ЎСЕ ПАЖАДАННІ ЎЛІЧАНЫ

Сяргей Аўчыннікаў адзначае, што ў новых правілах можна было прапісаць і яшчэ шэраг іншых ініцыятыў. У прыватнасці, уніфікаваць правілы здачы на правы: зрабіць іх падобнымі, як у іншых еўрапейскіх краінах.

«Цяпер яны адрозніваюцца. Напрыклад, у Германіі практычны экзамен дзесьці 1,5 гадзіны здаецца: 45 хвілін па горадзе, 45 хвілін — кіраванне па аўтабане. Думаю, што, напэўна, трэба было б пераглядзець многія пытанні і вызначыць, што ўзяць карыснага, тое, што ўжо даўно ёсць у іншых краінах. Можа, яно і не трэба ў нашых умовах, а можа — трэба. Час паказаў бы. Дарожная статыстыка здарэнняў — у першую чаргу. Таксама і абмежаванне хуткасці: чаму за мяжой 50 кіламетраў у гадзіну, а ў нас — 60?» — задаецца пытаннем спецыяліст па кіраванні.

З іншага боку, уніфікаваць ўсе правілы дарожнага руху па прыкладзе еўрапейскіх або расійскіх таксама наўрад ці магчыма. Усё ж такі многія пункты (у тым ліку пры здачы экзаменаў) абумоўлены асаблівасцямі мясцовасці, клімату і іншымі нюансамі, падкрэслівае Сяргей Аўчыннікаў.

### «АЎТАМАТ» ЦІ «МЕХАНІКА»?

Пачынаючых кіроўцаў заўсёды хвалюе пытанне, які аўтамабіль лепш абраць: з механічнай КПП або з АКПП? Правядзём параўнальную характарыстыку двух відаў трансмісіі з пункту гледжання іх пераваг і недахопаў. За аснову возьмем наступныя крытэрыі: цана, абслугоўванне і рамонт, ККД і разгон, надзейнасць, рэсурс эксплуатацыі, Умовы зімовага кіравання, камфорт, рэсурс счаплення і рухавіка і паводзіны машыны на дарозе.

#### *Цана пытання*

Аўтамат даражэйшы за механіку. Ды і расход паліва на аўтамаце будзе на 10—15 % большы, чым на механіцы. У асноўным гэта датычыцца гарадской язды, за горадам розніца па выдатку паліва будзе крыху меншая.



#### *Абслугоўванне і рамонт*

Абслугоўванне і рамонт аўтамабіля з аўтаматычнай КПП выйдуць даражэйшымі. Аўтамат патрабуе больш машыннага масла, чым механіка, ды і каштуе даражэй. Патрабуе замены і масляны фільтр. У параўнанні з аўтаматам механічная КПП простая ў абслугоўванні і не патрабуе дарагіх расходнікаў і запасных частак.

#### *ККД і разгон*

Дынаміка разгону ў механічнай трансмісіі лепшая, чым у аўтаматычнай КПП, ды і ККД у механікі вышэйшы. Механічная КПП дае магчымасць рэалізацыі ўсёй магутнасці рухавіка. Выключэнне складаюць рабатызаваныя каробкі перадач з двума счапленнямі.

#### *Надзейнасць*

Прастата ўстройства дазваляе механіцы ў параўнанні з аўтаматам прэтэндаваць на званне больш надзейнай каробкі перадач. Буксіроўка на працяглыя адлегласці на гнуткай або жорсткай счэпцы магчымая толькі для аўтамабіляў з механічнай КПП. Машыну з аўтаматам рэкамендуецца перавозіць толькі на эвакуатары. Ды і эксплуатацыя аўтамабіля, абсталяванага механікай, пры яздзе ў галалёдзіцу, па гразі і бездаражы будзе лепшая ў параўнанні з аўтаматам.

#### *Рэсурс эксплуатацыі*

І гэты крытэрый кажа на карысць механікі, рэсурс эксплуатацыі якой вышэйшы. Некаторыя механічныя каробкі могуць функцыянаваць нават пасля выхаду са строю «роднага» рухавіка аўтамабіля. Чаго нельга сказаць пра АКПП, якая праслужыць толькі да капрамонту.

#### *Зімовае кіраванне*

На аўтамабілі з механікай лягчэй ездзіць па слізкай паверхні і буксаваць у снезе. Для аўтамата гэтыя дзеянні не пажаданыя — можа перагрэцца трансмісійнае масла.

Такім чынам, па шасці разгляданых пазіцыях (кошт, абслугоўванне і рамонт, ККД і разгон, надзейнасць, рэсурс эксплуатацыі, умовы пры зімовым кіраванні) выйграе механічная каробка перадач. Паглядзім, чым адкажа аўтамат.

#### *Рэсурс рухавіка і счаплення*

У гэтым плане выйграе таксама аўтамат: ён кантралюе абароты і не дае рухавіку перагрэцца. На механіцы пры некарэктным пераключэнні перадач магчымая перагрузка матора. Пачаткоўцы могуць забыцца і не змяніць своечасова перадачу з ніжэйшай на вышэйшую, прымушаючы рухавік працаваць на павышаных абаротах.

Тое ж самае адносіцца і да счаплення. У аўтамабілі, абсталяваным аўтаматычнай КПП, няма неабходнасці пастаянна выключаць счапленне.

### ПАВОДЗІНЫ МАШЫНЫ НА ДАРОЗЕ

Аўтамабіль з аўтаматычнай КПП рухаецца плаўна, без рыўкоў, не адкочваецца на горцы. Аўтамат мае рэжым «паркінг», пры якім рухавік адключаецца ад трансмісіі, а выхадны вал каробкі механічна заблакіраваны. Гэты рэжым дазваляе машыне надзейна ўтрымлівацца на месцы.

Ну што ж, тры супраць шасці! Атрымліваецца, механіка лепшая за аўтамат? Можа. Але распрацоўшчыкі не стаяць на месцы і працуюць над новымі, усё больш дасканалымі разнавіднасцямі аўтаматычных каробак перадач. Калі за крытэрый узяць, напрыклад, паскарэнне аўтамабіля, то механіка разганяецца хутчэй за класічны аўтамат, а вось варыятарная каробка на эфектыўнасці дакладна не саступіць механічнай трансмісіі, а часам і перасягне яе.

Так што на пытанне, якую каробку перадач выбраць, няма адзінага, канкрэтнага меркавання. Усё залежыць ад таго, што для кіроўцы ў прыярытэце, а таксама ў якіх умовах ён збіраецца эксплуатаваць свой аўтамабіль. Калі ў асноўным плануецца язда па горадзе са шматлікімі пробкамі, то лепшым рашэннем будзе аўтамат. Пры руху за горадам дапушчальныя абедзве КПП. А эксплуатаванне машыны ў складаных дарожных умовах адназначна дыктуе выбар на карысць механікі.

Калі камфорт і хуткае навучанне ваджэнню для вас стаяць на першым месцы — выбірайце аўтамат. Хочаце адчуць хуткасць і раскруціць рухавік да мяжы — бярыце аўтамабіль з механічнай трансмісіяй.

**Данііл ДЗМІТРЫЕЎ.**

# ЖЫЦЦЁВЫЯ ДАРОГІ ТАЦЦЯНЫ АСТАШОНАК

## Доўгажыхарка з Пухавіцкага раёна адзначыла векавы юбілей

**Ці магла ўявіць Таццяна АСТАШОНАК з вёскі Ванькаўшчына, што дажыве да свайго стагоддзя?! Наўрад ці жанчына, якая перажыла ўсе жахі Вялікай Айчыннай вайны, зведала цяжкасці пасляваеннага жыцця, думала, што будзе святкаваць свой векавы юбілей у коле вялікай сям'і: сярод дзяцей, унукаў і праўнукаў.**

Павіншавалі з прыгожай датай доўгажыхарку і землякі. Старшыня Голацкага сельскага выканаўчага камітэта Віктар Малуха разам з начальнікам аддзялення па грамадзянстве і міграцыі Пухавіцкага РАУС Марынай Масленікавай уручылі ёй новы пашпарт. Пажартавалі, што праз 25 гадоў зноў памяняюць.

### Складанае дзяцінства

Ужо каторы год Таццяна Лаўрэнцьеўна знаходзіцца пад апекай сваёй малодшай дачкі Ірыны. Зімой доўгажыхарка праводзіць час у гарадской кватэры дзяцей (свайго зяця яна ўжо даўно лічыць за сына). А калі ўжо добра прыграе сонейка, разам з імі збіраецца ў вёску. Туды, як бы ні падводзіла здароўе, цягне заўсёды. Кожны раз не можа дачакацца, калі наступіць вясна і яны паедуць у родныя мясціны.

А нарадзілася Таццяна Асташонак у вёсцы Турэц, што ў Чэрвеньскім раёне. Выхоўвалася ў звычайнай сялянскай сям'і. Жылі сціпла, дзяцінства было складанае. З раніцы да вечара працавалі не складаючы рук. Бацька памёр рана, увесь хатні і гаспадарчы клопат лёг на кволыя жаночыя плечы — матчыны і дзвюх малалетніх дачок. І калі старэйшая сястра яшчэ мела магчымасць скончыць некалькі класаў, то Таццяне Лаўрэнцьеўне ўвогуле не давялося вучыцца. Каб хоць неяк існаваць, з малых гадоў яна вымушана была працаваць на пана.

— Мама выхоўвала панскіх дзяцей, — расказвае Ірына Хорава, дачка доўгажыхаркі. — У іх і жыла. Там хоць кармілі...

### Уцёкі з цягніка

Калі пачалася вайна, у іх згарэла хата, і Таццяна Асташонак разам з сястрой і пляменнікам пераехалі ў вёску Ванькаўшчына, што ў суседнім раёне. Працавала на аэрадроме ў Мачулішчах, які будаваўся. Цягала бярвёны, камяні — праца была, мякка кажучы, не жаночая. Але ў вайну на гэта ніхто не глядзеў. Часта на работы ездзілі пад бамбёжкамі. Аднойчы па дарозе на аэрадром у каня, які вёз людзей, трапіў снарад. Жывёлу разарвала на часткі, возчыка паранiла. Астатнія цудам засталіся жывыя.

— Як жа мы нагараваліся ў вайну, — згадвае Таццяна Лаўрэнцьеўна. — Часта даводзілася хавацца, бо ў вёску наведваліся немцы. Аднойчы акурат тады, калі ў нас былі партызаны. Залезлі на гарышча, і я разам з імі. Зайшлі немцы, пахадзілі ды выйшлі з хаты. Партызаны хацелі іх застрэліць, але мы з сястрой адгаварылі. Спаляць потым хату, дзе мы будзем жыць?! Абышлося...

Калі немцы прыйшлі ў Ванькаўшчыну наступны раз, акружылі вёску. Жыхароў сабралі каля могілак. Старых адправілі дахаты, у каго дзеці малыя — таксама. Вясковая жанчына, у якой былі блізняты, аддала аднаго з дзяцей Таццяне Асташонак. Аднак малая пачала плакаць і крычаць, што яна ёй не маці. Немцы забралі дзіця і аддалі сапраўднай маці, а Таццяну Лаўрэнцьеўну разам з астатнімі аднавяскоўцамі пагрузілі на машыну і павезлі ў Мінск.

«Пакінулі ў нейкай хаце, — расказвае Таццяна Асташонак. — А там халодна, брудна, мокра. Я нават апрануцца добра не паспела. Так і прасядзелі там некаторы час. Людзі нешта елі, а я галодная — нічога з сабой не ўзяла. У каго што было, не шкадавалі і мне давалі».

Раніцай людзей пагрузілі ў вагоны, у якіх вазілі цялят. Стала зразумела: павязуць у Германію. «Уваход быў зачынены дошчачкамі, — успамінае сведка тых падзей. — Адзін хлопец, выкарыстаўшы магчымасць, пакуль немцы адышлі, адняў дошчачку і зноў закрыў. Увечары вырашыў бегчы, прапанаваў і мне. А я не ведала, што рабіць: мне няма ў каго ў Мінску хавацца. У іх то цётка ў горадзе, то дзядзька, то сястра... Хлопец жа гэты быў харошы, сказаў, каб не баялася: калі, маўляў, атрымаецца ўцячы, то разам з ім пойдзем да яго цёткі, якая жыла недалёка».

Так і выйшла. Ішлі каля вагонаў, успамінае жанчына, як тыя мышы. Дабраліся да цёткі, яна іх пусціла. Сядзелі ціха, нават не елі. Гаспадыня некалькі разоў выходзіла на вуліцу, казала, што немцы бегаюць па станцыі — відаць, уцяклі не яны адны. Астатніх раніцай павезлі ў Германію...

### Пасля вайны

Таццяне Асташонак пашанцавала дачакацца Перамогі. Аднак не адразу стала лягчэй і пасля вайны — краіна аднаўлялася, трэба было прызвычайвацца жыць у новых умовах.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 6 чэрвеня 1945 года Таццяна Лаўрэнцьеўна была ўзнагароджана медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». З узнагародай у свой час гулялі дзеці, згубілі. Жанчына не надала гэтаму значэння. Толькі ў 1991 годзе даведалася, што мае права на пэўныя льготы.

Усё жыццё яна працавала. Па звестках калгаснага архіва, працоўны стаж жанчыны пачынаецца з 1938 года. Вядома, сюды не ўпісаны гады, калі яна даглядала



Старшыня Голацкага сельскага выканаўчага камітэта Віктар МАЛУХА разам з начальнікам аддзялення па грамадзянстве і міграцыі Пухавіцкага РАУС Марынай МАСЛЕНІКАВАЙ уручылі доўгажыхарцы новы пашпарт.

панскіх дзяцей. У калгасе, які першапачаткова насіў імя Ільіча (цяпер Камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Голацк»), кім толькі не была: і палаводам, і птушніцай, і цялятніцай. Акрамя асноўнай работы і працы па гаспадарцы, кожнай сям'і трэба было нарыхтоўваць лён, буракі.

«І арала, і баранавала, — расказвае Таццяна Лаўрэнцьеўна. — Яшчэ прасіла брыгадзіра падкінуць цяжэйшай работы, каб болей зарабіць: трэба ж было карміць чацвярых дзяцей. Муж, інвалід вайны, хварэў».

Разам з мужам-франтавіком яны выхавалі чацвярых дзяцей.

— У майго бацькі, Фёдара Васільевіча, таксама лёс быў няпросты, — расказвае Ірына Фёдараўна. — Ён і савецка-фінскую вайну прайшоў, і Вялікую Айчынную. Падчас апошняй быў шафёрам, вазіў нейкага военачальніка. Трапіў у палон. Саскочыў з цягніка, калі ваеннапалонных кудысьці везлі. Расказваў, як шмат у вагоне было вошай. Ён жа за пазухай хаваў хлеб. Калі ўжо, будучы на волі, дастаў яго, каб з'есці, вачам сваім не паверыў: увесь кавалак быў у вошах.

Фёдар Асташонак дайшоў да Польшчы. У 1946 годзе падарваўся на міне, у Познані ляжаў у шпіталі. Крыху падлячыўшы, яго камісавалі. Мужчына вярнуўся на Радзіму.

...Ужо шмат часу прайшло пасля тых падзей, але вайна дагэтуль у памяці Таццяны Асташонак. Увесь час паўтарае: «Не дай бог такое больш перажыць». Навіны бабуля хоць і глядзіць, але мала што разумее. Добра, кажа дачка, што нічога не чуе. З гэтым, вядома, не паспрачаешся...

**Вераніка КАНЮТА.**


## РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

**извещает о проведении 07.04.2022 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства**

**Лот № 1.** Незарегистрированное капитальное строение общей площадью 22,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Солигорский р-н, 1А/36, блок 10, ГСПК «Рудник-шлам». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 625000000012000088 площадью 4,1736 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 648,00 бел. рублей, задаток – 64,80 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым номером 321081600009000030 площадью 0,0922 га (право собственности), расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Грабовский с/с, сад. тов-во «Ягодка», 45. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 668,82 бел. рублей, задаток – 166,88 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Земельный участок с кадастровым номером 624487600006000010 площадью 0,0397 га (право собственности), расположенный по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, Блужский с/с, СТ «Спадчина-88». Целевое назначение: садоводство в садоводческом товариществе «Спадчина-88». **Начальная цена продажи – 468,46 рублей, задаток – 46,85 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4**. Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-20101 общей площадью 554,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Мозырь, ул. Портовая, 16. Назначение: здание многоквартирного жилого дома; наименование: двухэтажное кирпичное здание. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000010000076 площадью 0,2704 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 7 061,04 бел. рублей, задаток – 706,10 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Земельный участок с кадастровым номером 623881700034000105 площадью 0,0676 га, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Красненский с/с, СТ «Монолит-92», У-109. Целевое назначение: земельный участок для ведения коллективного садоводства (право собственности). **Начальная цена продажи – 2 967,64 бел. рублей, задаток – 296,76 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-166411 общей площадью 104,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 74, р-н аг. Луговая Слобода. Назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование: склад. Составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный склад. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000871 площадью 0,6286 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 27 820,80 бел. рублей, задаток – 2 782,08 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-171612 общей площадью 188,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 74/1, р-н аг. Луговая Слобода. Назначение: здание специализированное водохозяйственного назначения; наименование: насосная станция Сигма-5. Составные части и принадлежности: одноэтажное сооружение насосная станция Сигма-5-1А1/кп. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000871 площадью 0,6286 га (право постоянного пользования).

*В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 70 502,40 бел. рублей, задаток – 7 050,24 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-166412 общей площадью 103,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Минский р-н, Луговослободской с/с, 74/2, р-н аг. Луговая Слобода. Назначение: здание специализированное сельскохозяйственного назначения; наименование: склад материально-технический. Составные части и принадлежности: одноэтажный кирпичный склад материально-технический. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 623684100001000871 площадью 0,6286 га (право постоянного пользования). *В отношении капитального строения имеется действующий договор аренды.* **Начальная цена продажи – 27 820,80 бел. рублей, задаток – 2 782,08 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 720/С-13293 общей площадью 21,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Горецкий р-н, г. Горки, ул. Мира, 61А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: погребня с погребом. Составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание погребни с погребом. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 722050100001006921 площадью 0,7278 га (2/15 доли на праве аренды). **Начальная цена продажи – 3 384,00 бел. рублей, задаток – 338,40 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 10.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-4566 общей площадью 59,7 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Портовая, 23/3. Назначение: здание проходной «Южная»; наименование: одноэтажное кирпичное здание проходной «Южная». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000010000632 площадью 11,2361 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 13 910,40 бел. рублей, задаток – 1 391,04 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 11.** Капитальное строение с инвентарным номером 700/С-90649 общей площадью 128,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Габровская, 31Б. Назначение: здание специализированное розничной торговли; наименование: магазин «Колос-16». Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание магазина «Колос-16». Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000007005187 площадью 0,0155 га (право аренды). **Начальная цена продажи – 122 400,00 бел. рублей, задаток – 12 240,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 12.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-166725 общей площадью 196,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 240А/2. Назначение: здание административно-хозяйственное; наименование: административный корпус. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000006000401 площадью 0,992 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 92 340,00 бел. рублей, задаток – 9 234,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 13.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-57155 общей площадью 131,5 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание склада. Составные части и принадлежности: одноэтажное металлическое здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073440 площадью 0,2972 га (право постоянного пользования). **Начальная цена продажи – 15 390,00 бел. рублей, задаток – 1 539,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 14.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-57154 общей площадью 982,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание склада. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельно-кирпичное здание склада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073439 площадью 0,2813 га (право постоянного пользования). *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 238 950,00 бел. рублей, задаток – 23 895,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 15.** Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-114213 общей площадью 621,0 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 29А. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: столярный цех. Составные части и принадлежности: одноэтажное панельное основное строение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000007073440 площадью 0,2972 га (право постоянного пользования). *Является объектом ипотеки*. **Начальная цена продажи – 182 250,00 бел. рублей, задаток – 18 225,00 бел. рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by в разделе «Недвижимость».

**Аукцион состоится 07.04.2022 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.**

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (отдел по реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

**Окончание приема заявлений – 04.04.2022 в 15.00.**

Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **07 апреля** 2022 года.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 44 763 62 63.**

# СПАКУСА ДЛЯ ПРАЙДЗІСВЕТАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Хоць цалкам верагодна, што акрамя сацсетак ёсць і іншыя крыніцы атрымання персанальных даных.

Дарэчы, аўтар гэтых радкоў не прысутнічае ні ў адной з папулярных сацсетак, але лжэбанкіры не раз званілі і мне на вайбер. Значыць, карыстаюцца яны шэрагам магчымасцяў. Калі падумаць, то ёсць многа выпадкаў, калі мы пакідаем пашпартныя даныя ў розных службах і арганізацыях. А цяпер, калі грамадскія адносіны ўсё болей пераходзяць у лічбавы фармат, значнасць персанальных даных узрастае і адначасова павышаецца патрэба ў іх абароне. Калі гэтага своечасова не зрабіць, адкрыюцца неабмежаваныя магчымасці для выкарыстання даных, мякка кажучы, нам не на карысць.

Менавіта ўказаныя абставіны сталі нагодай для развіцця заканадаўчай базы. У маі 2021 года парламентам быў прыняты Закон «Аб абароне персанальных даных», які 15 лістапада мінулага года ўступіў у сілу. А сёлета ў краіне запрацаваў Нацыянальны цэнтр абароны персанальных даных (НЦАПД). Адной з асноўных задач цэнтра з'яўляецца арганізацыя адукацыі ў сферы абароны ПД. Для гэтага супрацоўнікі цэнтра выязджаюць у рэгіёны і сустракаюцца з зацікаўленымі. На семінары запрашаюць прадстаўнікоў устаноў і арганізацый, якія працуюць з данымі людзей. Мабыць, ужо многія на рабоце падпісвалі дазвол свайму работадаўцу на маніпуляцыі з уласнымі персанальнымі данымі. Цяпер нават у дзіцячых гуртках, паводле слоў каляжанкі, патрабуецца такі дазвол. Але наш дазвол аўтаматычна накладвае на афіцыйную юрыдычную ці фізічную асобу абавязацельствы па абароне нашых звестак.

Падрабязна аб гэтым гаварылі на семінары ў Брэсце. Форум арганізаваў Нацыянальны цэнтр абароны персанальных даных. **Намеснік дырэктара цэнтра Сяргей ЗАДЗІРАН** зрабіў спачатку кароткі экскурс у гісторыю пытання:

— Да нейкай пары грамадства пра гэта не задумвалася, не адчувалася патрэбы вызначаць правілы ў названай галіне. Але калі большасць адносін стала сыходзіць у лічбавы фармат, з'явілася патрэба ў абароне, у законным выкарыстанні персанальных даных. Першы міжнародны дакумент з гэтай нагоды паявіўся 40 гадоў таму. Канвенцыя Савета Еўропы аб абароне правоў фізічных асоб пры аўтаматызаванай апрацоўцы персанальных даных — гэта дакумент у адказ на факт, што персанальныя даныя сталі збірацца, абагульняцца і выкарыстоўвацца ў аграмаднай колькасці. З'явілася аб'ектыўная неабходнасць правілаў, якія гарантуюць бяспеку чалавека. Прытым павінен захоўвацца пэўны баланс паміж перавагамі, якія мы атрымліваем ад лічбы ў шырокім сэнсе, і самім працэсам збору, апрацоўкі, выкарыстання звестак. Як вядома, і наша заканадаўства зведала карэкцыроўкі, з'явіўся закон, а таксама наш цэнтр як орган, што атрымаў паўнамоцтвы па абароне персанальных даных.

На семінары мы расказваем аб усіх навацыях, нагадваем службовым асобам аб іх адказнасці. Мы падрыхтавалі партфель аператара, пэўны набор тыповых рашэнняў, якія дазволяць нашым калегам вывесці гэту работу на прафесійны ўзровень, — зазначыў Сяргей Уладзіміравіч.

На брэсцкі семінар-нараду сабраліся кіраўнікі і профільныя спецыялісты выканаўчых камітэтаў, устаноў і арганізацый, у анлайн-фармаце да мерапрыемства далучыліся раённыя цэнтры. Спецыялісты Нацыянальнага цэнтра абароны персанальных даных расказалі пра стандарты абароны, праваадносіны, суб'екты, на якія распаўсюджваецца дзеянне закона. Асобным блокам былі раскрыты пытанні апрацоўкі персанальных даных у сувязі з працоўнай дзейнасцю і прадстаўлены пакрокавы алгарытм дзеянняў аператара для абароны даных, якія апрацоўваюцца.

Акрамя таго, былі прэзентаваныя адукацыйныя праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у гэтай галіне. Як адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення адукацыйных паслуг і сувязяў з грамадскасцю НЦАПД Вольга ШЫБКО,** адукацыя, асвета на гэту тэму на дадзеным этапе — галоўнае. Вучыць трэба як аператараў, так і саміх людзей. Усе павінны ўсвядоміць, што персанальныя даныя — каштоўнасць, распараджацца імі трэба надзвычай абачліва. Часта самі грамадзяне выкладаюць у сацсеткі занадта многа звестак. Не задумваючыся адпраўляюць недзе, напрыклад, ксеракопію пашпарта па электроннай пошце, што сёння выглядае небяспечна.

— Людзі павінны гэта ведаць, ведаць свае правы ўлічваць тры галоўныя пастулаты працэсу: персанальныя даныя збіраюцца са згоды чалавека альбо на законных падставах, павінна быць забяспечана іх абарона, не дапускаецца распаўсюджванне ПД, акрамя законных падстаў, — сказала Вольга Шыбко.

Калі ж чалавек лічыць, што яго правы былі парушаны, найперш ён павінен звярнуцца да аператара, юрыдычнай ці фізічнай асобы, якая тыя даныя збірала і апрацоўвала: гэта могуць быць установа аховы здароўя, індывідуальны прадпрымальнік, арганізацыя ці ўстанова, дзе працуе грамадзянін, і высветліць прычыну ўцечкі. У выпадку калі аператар не даў здавальняльнага тлумачэння, грамадзянін мае права раз на год звярнуцца ў НЦАПД з пісьмовай скаргай на дзеянні аператара на адрас цэнтра ў Мінску: вул. Клары Цэткін, 24. Можна напісаць і электронны зварот, для чаго неабходна зайсці на сайт цэнтра. Дарэчы, рэкамендацыі па абароне ўласных персанальных даных можна атрымаць на сайце і ў тэлеграм-канале цэнтра.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Запрашальнік

# У гістарычнай рэтраспектыве падручніка

## Выстаўка падручнікаў адкрылася ў БДУ

**У тэматычную экспазіцыю «Навучальная літаратура ў гістарычнай рэтраспектыве» ўвайшло каля 40 кніг з фонду рэдкіх і каштоўных выданняў. Сярод экспанатаў прадстаўлены айчынныя і замежныя падручнікі і навучальныя дапаможнікі, выдадзеныя з сярэдзіны XIX стагоддзя да 1950 года: «Лекцыі арганічнай хіміі (1880 год), «Курс элементарнай агульнай хіміі» (1863), «Зборнік задач вышэйшай матэматыкі» (1911), «Курс элементарнай геаметрыі» (1923), а таксама «Асновы параўнальнай анатоміі бесхрыбтовых».**



Фота прэс-службы БДУ.

Усяго ўніверсітэцкая калекцыя навучальнай літаратуры ўключае больш за дзве тысячы выданняў. Самаму стараму падручніку больш за трыста гадоў — гэта «Арыфметыка Магніцкага» (1703).

Наведаць выставу могуць усе ахвотныя па буднях з 9.00 да 17.00 па адрасе: праспект Незалежнасці, 4, каб. 313 (зала «Абанемент навучальнай літаратуры»). Экспазіцыя будзе дзейнічаць да 30 чэрвеня. Уваход вольны.

Арганізатарам мерапрыемства выступае Фундаментальная бібліятэка БДУ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Черниковщина, дер. Гончаровка, дер. Загорье Заболотского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **27 апреля 2022 года, в 11.00, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1А, Заболотский сельисполком, кабинет председателя** |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Заболотский сельский исполнительный комитет, 222223, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, д. 1А |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот № 1**– площадь 0,1500 га, №624882007101000428, дер. Черниковщина, объект № 65/2020. **Лот № 2** – площадь 0,1479 га, № 624882001601000381, дер. Гончаровка, объект № 27/2019. **Лот № 3** – площадь 0,1500 га, № 624882003101000195, дер. Загорье, объект № 15/2021 |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | **Лот № 1** – 25 000 рублей. **Лот № 2** – 30 000 рублей. **Лот № 3** – 30 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | а) продажа по цене не ниже начальной;<br>б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории Республики Беларусь;<br>в) **без права предоставления рассрочки;**<br>г) возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298;<br>д) при подаче заявления на определенный лот только одним участником, земельный участок продается по начальной цене, увеличенной на 5 %;<br>е) наличие не менее двух участников;<br>ж) получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома; приступить к занятию (освоению) земельного участка в течение одного года со дня получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения прав на него |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | **дер. Черниковщина** – имеется возможность подключения объекта строительства к сетям электроснабжения; **дер. Гончаровка** – нет возможности подключения объекта строительства к инженерным сетям; **дер. Загорье** – имеется возможность подключения объекта строительства к сетям электроснабжения, газоснабжения |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10 % от начальной (стартовой) цены земельного участка, получатель – Заболотский сельисполком, р/с BY86AKBB36410000007286200000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Смолевичи, БИК AKBBBY2X, УНН 600023902 |
| 12 | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | Каждую среду в 12.00 |
| 13 | **Дата начала приема документов** | С 28 марта 2022 года в рабочие дни ежедневно |
| 14 | **Окончательный срок приема документов** | 21 апреля 2022 года в 17.30 |
| 15 | **Контактные телефоны** | 8-01776-44-7-38, 44-2-16 |

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения результатов аукциона внести плату за земельный участок, а также возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона: лот № 1 – 2437,11 руб.; лот № 2 – 1761,66 руб., лот № 3 – 2061,62 руб. (указаны затраты без учета стоимости информационного сообщения).

**Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт и его копия) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).



## ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «АльфаГНБ»**
(УНП 691577953, Минск, ул. Корш-Саблина, д. 9, пом. 5Н),
**находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)**

***Дата и время проведения торгов*: 19 апреля 2022 года**. Начало – 10.00. Заявки принимаются с 19 марта 2022 года по 17 апреля 2022 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «АльфаГНБ» (УНП 691577953)** в лице антикризисного управляющего – директора ООО «Деловой консалтинговый центр» Поповой Екатерины Александровны, тел. 8 (029) 269-08-33.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Легковой внедорожник универсал RENAULT KAPTUR, 2018 г. в., кузов X7LASREA761594473 | 28 000,00 | 10 % | 10 % |

**Для участия в торгах необходимо:**

1. В срок до 15.00 **17 апреля 2022 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».

2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 17.04.2022 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лота: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:
- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников, либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 15 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

# Педагогіка: поўнае паглыбленне ў прафесію

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Практыкаарыентаванасць навучання — галоўная ўмова фарміравання будучага педагога, — падкрэслівае рэктар БДПУ. — Зразумела, што «выхаваць» настаўніка толькі ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях немагчыма, тым больш што ў прафесійнай дзейнасці ад яго патрабуецца ўменне прымяняць свае веды ў любой сітуацыі, а не толькі ў стандартнай. Таму ўдасканаленню педагагічнай практыкі нашых студэнтаў мы ўдзяляем асаблівую ўвагу. Упэўнены, што педагагічная практыка павінна мець бесперапынны характар і праходзіць праз усё навучанне — з першага да чацвёртага курса. Толькі ў гэтым выпадку забяспечваецца максімальна ранняе паглыбленне будучых педагогаў у прафесійнае асяроддзе, прычым, што вельмі важна, іх бесканфліктнае ўваходжанне ў педагагічную прафесію. Яшчэ ў 2015—2016 вучэбным годзе ў эксперыментальным рэжыме мы ўвялі абавязковую валанцёрскую практыку на першым курсе і педпрактыку з выдзяленнем аднаго дня ў тыдзень для знаходжання ў школе для другакурснікаў. Вопыт нашага ўніверсітэта даказаў эфектыўнасць гэтых крокаў.

У 2020 годзе выйшаў загад Міністэрства адукацыі аб мерах па павышэнні якасці падрыхтоўкі педагагічных кадраў. У гэтым дакуменце знайшлі адлюстраванне актуальныя тэндэнцыі, у тым ліку бесперапыннасць педагагічнай практыкі, пачынаючы з першага курса. У Канцэпцыі развіцця педагагічнай адукацыі на 2021—2025 гады таксама занатаваны новы падыход да арганізацыі педагагічнай практыкі з першага да чацвёртага курса з паслядоўна выбудаваным зместам, які ўскладняецца ад курса да курса. Што маецца на ўвазе?

Для першакурснікаў прадугледжваецца азнаямленчая практыка. Для іх гэта магчымасць праверыць на практыцы свой педагагічны патэнцыял. Студэнты назіраюць за сістэмай унутрышкольных адносін, знаёмяцца са зместам і характарам прафесійнай педагагічнай дзейнасці, вучацца ўсталёўваць кантакт з навучэнцамі і выхаванцамі, пераносяць свае тэарэтычныя веды на практычныя сітуацыі, сутыкаюцца з першымі прафесійнымі праблемамі. У іх фарміруецца педагагічная свядомасць, якая з плоскасці ідэальных уяўленняў пераходзіць у сістэму рэальных установак і поглядаў. Гэта, безумоўна, спрыяе фарміраванню каштоўнаснага стаўлення студэнта да будучай прафесійнай дзейнасці. Мы бачым, што менавіта каштоўнаснае стаўленне да прафесіі і робіць потым педагогаў паспяховымі.

## Досвед у канцэнтраваным выглядзе

На другім курсе студэнтаў чакае вучэбна-пошукавая практыка, якая дае магчымасць на падставе назіранняў за дзейнасцю настаўніка паглыбіць свае веды пра класнаўрочную сістэму, тыпы і структуру ўрока, сучасныя метады і прыёмы навучання, адукацыйныя тэхналогіі. Практыканты наведваюць і аналізуюць урокі настаўнікаў, знаёмяцца з вядзеннем школьнай дакументацыі, відамі планавання, формамі арганізацыі вучэбнага працэсу, зместам падручнікаў і праграмы, вучацца аналізаваць узаемадзеянне педагога з навучэнцамі. Паглыбляюцца іх веды па педагогіцы і псіхалогіі, развіваюцца і ўдасканальваюцца аналітычныя, арганізатарскія і камунікатыўныя ўменні і навыкі. Педагагічная практыка на трэцім курсе дазваляе студэнтам выступаць ужо ў ролі настаўнікаў, праводзіць заліковыя і адкрытыя ўрокі, выхаваўчыя мерапрыемствы. Вывучаюцца і аналізуюцца індывідуальныя рысы асобы навучэнца, вызначаюцца найбольш эфектыўныя шляхі яе развіцця і карэкцыі.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Акрамя таго, трэцякурснікаў чакае яшчэ і летняя практыка ў аздараўленчых дзіцячых установах. Як падкрэслівае Аляксандр Жук, для бучых педагогаў гэта ўнікальная магчымасць навучыцца кіраваць дынамікай часовага дзіцячага калектыву (ён можа быць як аднаўзроставы, так і рознаўзроставы), авалодаць living рознымі формамі і спосабамі ўзаемадзеяння як з групамі выхаванцаў, так і з асобнымі дзецьмі, у тым ліку ў нефармальных умовах і сітуацыях, навучыцца пастаянным стасункам з імі на працягу дня, тыдня і змены, аказанню дапамогі ў вырашэнні іх асабістых праблем, стварэнню ўмоў для іх самарэалізацыі. Эфектыўнасць такой практыкі цяжка пераацаніць. Гэта канцэнтраванае паглыбленне ў выхаваўчую работу з дзецьмі, магчымасць атрымання вопыту прафесійнай дзейнасці ў сціснутыя тэрміны і ў канцэнтраваным выглядзе. Усё ж такі падчас праходжання педпрактыкі ў школах больш увагі там удзяляецца адукацыйнаму працэсу, чым выхаваўчай рабоце. Для параўнання: непасрэднае выхаваўчае ўзаемадзеянне класнага кіраўніка з дзецьмі ў школе складае 4-5 гадзін на тыдзень, гэта прыкладна 180 гадзін на працягу вучэбнага года, а ў выхавальніка ў дзіцячай аздараўленчай установе — гэта 15-16 гадзін у суткі, або 300 гадзін за адну змену.

«Для будучага педагога летняя практыка дазваляе стварыць скарбонку шматлікіх заняткаў, гульняў і форм альтэрнатыўнага дзіцячага адпачынку. На жаль, колькасць стацыянарных летніх аздараўленчых лагераў паступова змяншаецца, таму база для праходжання летняй педпрактыкі звужаецца, але ёсць альтэрнатыва — шосты школьны дзень. Можна арганізаваць выхаваўчую педпрактыку па школьных суботах, каб студэнты дапамагалі педагогам у арганізацыі нефармальных мерапрыемстваў. Мяркую, што дырэктары і іх намеснікі будуць нам за гэта толькі ўдзячныя, — разважае Аляксандр Жук. — Можна таксама разгарнуць сваю дзейнасць і ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі...»

Ну і на чацвёртым курсе студэнтаў чакае пераддыпломная практыка, падчас якой адбываецца ўжо ўдасканаленне іх прафесійнай падрыхтоўкі, шліфуюцца прафесійныя якасці, фарміруецца ўменне планаваць сваю дзейнасць і даследчыя ўменні.

— Дадзеная ідэя арганізацыі бесперапыннай педпрактыкі закладзена ў адукацыйных стандартах і тыпавых вучэбных планах новага пакалення, па якіх мы пачалі працаваць з гэтага навучальнага года, — падкрэслівае рэктар БДПУ. — Важна, што пры такім падыходзе адбываецца паступовае асваенне розных педагагічных роляў. Падчас азнаямленчай практыкі студэнт — актыўны назіральнік, на другім курсе — ужо памочнік педагога, на трэцім — настаўнік і педагог. Падчас летняй практыкі — выхавальнік, а на пераддыпломнай практыцы — педагог- эксперт, педагог-даследчык. Паколькі на штодзённых уроках, як правіла, адсутнічаюць кантралёры, ад умення настаўніка рэфлексаваць і рабіць самаацэнку сваёй дзейнасці залежыць рост яго прафесіяналізму.

## Дзе слабае месца?

Цікавыя вынікі былі атрыманы падчас правядзення рэспубліканскага апытання з мэтай даведацца, як арганізавана педагагічная практыка ў ВНУ — суб'ектах вучэбна-навукова-інавацыйнага кластара — сёння.

— Рэалізацыя бесперапыннай педагагічнай практыкі вымагае ўзмацнення самастойнасці студэнтаў, іх рэфлексіі ад курса да курса, дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі яе зместу, — разважае Аляксандр Жук. — Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што выпускнікі профільных педкласаў пачалі паглыбленне ў прафесію намнога раней: яны ўжо маюць і сваё прафесійнае партфоліа, і вопыт даследаванняў, таму для іх усе заданні па практыцы, пачынаючы з першага курса, павінны прапаноўвацца з улікам іх папярэдняга вопыту. Плюс можна выкарыстоўваць гэтых хлопцаў і дзяўчат у якасці цьютараў для тых студэнтаў, якія не навучаліся ў педкласах. Мы пацікавіліся, ці ўлічваецца пры арганізацыі педагагічнай практыкі наяўнасць першаснага вопыту педагагічнай дзейнасці ў студэнтаў. 73 працэнты апытаных адказалі, што не ўлічваецца, 17 працэнтаў далі станоўчы адказ і 10 працэнтаў адказалі, што толькі часткова. Між іншым, на сёння на педагагічных спецыяльнасцях навучаюцца ўжо 2,5 тысячы выпускнікоў профільных педагагічных класаў, летась адбыўся першы выпуск з педагагічных спецыяльнасцяў маладых людзей, якія прайшлі праз педкласы. Такім студэнтам трэба прапаноўваць больш складаныя ролі. І мы думаем, што базамі для педпрактыкі павінны станавіцца ў першую чаргу навучальныя ўстановы, дзе дзейнічаюць профільныя педагагічныя класы і філіялы кафедраў ВНУ. Такое аб'яднанне намаганняў абавязкова дасць сінергетычны эфект.

Нас цікавіла, ці ўлічваецца меркаванне студэнтаў пры выбары базы для праходжання практыкі? Усё ж такі даволі шмат маладых людзей ужо працуюць з трэцяга курса. Гэта актуальна для Мінска і Мінскай вобласці, дзе адчуваецца дэфіцыт педагагічных кадраў. Дык дзе працуючым студэнтам праходзіць практыку? Рэспандэнтамі было адзначана, што для студэнтаў, якія працуюць і маюць сярэдні бал па вучобе, не ніжэйшы за «8», магчымы варыянт праходжання практыкі па месцы іх працы.

Шчыра кажучы, узнікае пытанне: а ці ўсім студэнтам можна дазволіць сумяшчаць вучобу ва ўніверсітэце з работай ва ўстановах адукацыі? Мяркуем, што трэба браць пад увагу іх паспяховасць. Калі іх сярэдні бал ніжэйшы за 7,2 (а па стандартах якасці гэта мінімальны ўзровень), то, напэўна, лепш засяродзіцца на вучобе, бо калі ты тут не спраўляешся, то якім педагогам станеш?

Падчас апытання высветлілася, што больш за ўсё студэнтам падабаецца выконваць падчас праходжання практыкі творчыя заданні са стварэннем уласнага адукацыйнага прадукту; заданні, якія датычацца арганізацыі работы па непасрэдным узаемадзеянні з дзецьмі; заданні на выкарыстанне інфармацыйных тэхналогій і элементаў праектнага метаду; інтэграваныя заданні. Яны з задавальненнем выконваюць функцыі класнага кіраўніка, удзельнічаюць у метадычных мерапрыемствах.

— На жаль, сярод задач, якія падабаецца выконваць студэнтам, няма заданняў даследчага і аналітычнага характару, — канстатуе Аляксандр Жук. — Таму мы лічым, што трэба пашыраць рэалізацыю даследчага падыходу ў падрыхтоўцы нашых студэнтаў.

А якія ж заданні выклікаюць у студэнтаў складанасці? Высветлілася, што гэта работа з бацькамі, афармленне вучэбна-праграмнай дакументацыі, планаў, арганізацыя інтэграванага навучання, праца са слабымі вучнямі (педагогі сёння больш нацэлены на работу з адоранымі навучэнцамі), выступленне на публіцы, арганізацыя ўзаемадзеяння з педагогамі школы. Практыкантам складана ацэньваць, як прасунуўся ў засваенні праграмы кожны навучэнец. Ім складана падбіраць формы, метады і прыёмы работы з дзецьмі з улікам іх мэтазгоднасці і пасільнасці для канкрэтнай дзіцячай аўдыторыі, матываваць да вывучэння свайго прадмета.

Мы папрасілі таксама выказацца наконт далейшага ўдасканалення бесперапыннай педагагічнай практыкі. Былі агучаны прапановы наконт распрацоўкі інтэграваных заданняў, якія ўключаюць метадычны, педагагічны і псіхалагічны складнік, таксама прапаноўвалася выдзяляць у вучэбных планах больш гадзін на праходжанне практыкі, адлюстроўваць дасягненні студэнтаў, якія паспяхова прайшлі практыку, у характарыстыках выпускнікоў, пры вывядзенні рэйтынгавых балаў і ўлічваць гэту інфармацыю пры размеркаванні маладых спецыялістаў.

Дарэчы, маладыя педагогі, якія прыходзяць у школы, прызнаюцца, што спярша ім зусім няпроста прызвычаіцца да таго, што завуць іх ужо не Каця або Сярожа, а Кацярына Аляксандраўна або Сяргей Уладзіміравіч і што не іх зараз выклічуць да дошкі. Больш за тое, галоўнымі «дырыжорамі» ў дзіцячым аркестры павінны стаць менавіта яны. І хочацца, каб у іх гэта абавязкова атрымалася...

Добрая навіна

# МАЛАДАЯ НАВУКА: СЁННЯ І ЗАЎТРА

**На Агульным сходзе Савета маладых вучоных НАН Беларусі абраны новы склад савета і новы старшыня. У мерапрыемстве, якое праходзіць у такім фармаце раз на тры гады, прынялі ўдзел прадстаўнікі Саветаў маладых вучоных аддзяленняў акадэміі (адзін дэлегат — ад 25 маладых даследчыкаў), акадэмікі-сакратары, кіраўніцтва Акадэміі навук. Напярэдадні ва ўсіх аддзяленнях прайшлі справаздачныя сходы Саветаў маладых вучоных.**

У выніку адкрытага галасавання **старшынёй Савета маладых вучоных НАН Беларусі быў абраны Станіслаў ЮРЭЦКІ, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук.** Адбыліся таксама выбары намеснікаў старшыні і вучонага сакратара Савета маладых вучоных НАН Беларусі.

— Штогод шэрагі супрацоўнікаў Акадэміі навук папаўняюць 300—350 маладых спецыялістаў. Цяпер у арганізацыях НАН Беларусі працуе каля 2 тысяч 200 маладых даследчыкаў. Гэта вялікі творчы патэнцыял, — адзначыў на пасяджэнні Агульнага сходу **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ.** — Сёння мы ставім перад навуковымі арганізацыямі адказныя задачы. І маладыя не могуць заставацца ўбаку ад вырашэння гэтых важных праблем, яны павінны актыўна ўключацца ў самыя апошнія, прарыўныя распрацоўкі. Гэта база для іх навуковага росту.

Кіраўнік НАН Беларусі падкрэсліў, што Савет маладых вучоных НАН Беларусі правёў шмат знакавых мерапрыемстваў. Гэта сур'ёзная арганізацыя, якая спраўляецца з адказнымі даручэннямі. «Мы ўскладаем на моладзь вялікія спадзяванні. Падтрымка маладых вучоных — прыярытэт у дзейнасці Нацыянальнай акадэміі навук», — дадаў Уладзімір Гусакоў.

Сярод знакавых мерапрыемстваў, праведзеных Саветам маладых вучоных у мінулым годзе, — Міжнародная навуковапрактычная канферэнцыя «Моладзь у навуцы — 2021», Рэспубліканскі маладзёжны форум «Беларусь інтэлектуальная», Тыдзень адкрытых дзвярэй, серыя міждысцыплінарных круглых сталоў па прарыўных напрамках навукі, Школа маладых вучоных, III Фестываль навукі — 2021, форум «Шлях у навуку», конкурс «100 талентаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» і іншыя.

Традыцыйным стала супрацоўніцтва з агульнымі сярэднімі і вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краіны, арганізацыя выступленняў з дакладамі і лекцыямі маладых вучоных НАН Беларусі ў рамках спецыяльных змен для адораных навучэнцаў у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», правядзенне школ юных даследчыкаў.

На Агульным сходзе абмеркавалі таксама правядзенне «Фестывалю навукі — 2022». Плануецца, што імпрэза традыцыйна адбудзецца ў верасні 2022 года. Дарэчы, летась Фестываль навукі наведала каля 10 тысяч чалавек.

**Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 53 (579)

**Неаднойчы на старонках выданняў Выдавецкага дома «Звязда» чытачы маглі сустрэць прозвішча Таццяны ДЗЕМІДОВІЧ, прычым пад публікацыямі розных жанраў: проза, паэзія, гумар, творы для дзяцей... Аднойчы Тацццяна стала нават пераможцам конкурсу апавяданняў газеты «Звязда», хоць гэта толькі адна са шматлікіх творчых узнагарод пісьменніцы. У снежні 2016 года яна была абрана старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як у няпросты сённяшні час працаваць са словам, абуджаць цікавасць да роднай культуры і гістарычную памяць? Пра гэта Тацццяна Дземідовіч распавядае чытачам «Звязды».**

# «Нараджэнне твора пачынаецца з унутранага гарэння...»

## ЧЫМ ЖЫВЕ ЛІТАРАТУРНАЯ БРЭСТЧЫНА

***— Вы кіруеце літаратурным клубам «Літара». Як ён узнік, што там адбываецца, хто туды прыходзіць? І ці можна, на вашу думку, кагосьці зрабіць спецыялістаў «звычайных» прафесій?***

— Літаратурны клуб «Літара» пры Брэсцкім гарадскім цэнтры культуры быў створаны ў 2006 годзе і тады аб'ядноўваў маладых пісьменнікаў, творчасць якіх заўважная і сёння. Да нашай дзейнасці далучаліся мастакі, музыканты. Намаганнямі клуба ўдалося выдаць шэраг калектыўных зборнікаў. Але я стала старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення СПБ і перадала кіраўніцтва клубам Лідзіі Касачук, педагогу на пенсіі.

Мая праца з маладымі пісьменнікамі «перамясцілася» ў Школу маладога літаратара. Напачатку настаўнікі прыводзілі да нас цэлыя класы, але хутка стала зразумела, што першыя спробы пяра — справа вельмі тонкая. Да творчасці юных трэба падыходзіць далікатна. Не ўсе гатовыя выстаўляць на шырокую аўдыторыю свае вершы ці прозу. Маладыя пісьменнікі ў прыватных гутарках пасля сустрэч з нашымі паэтамі і празаікамі прызнаюцца, што спачатку нясмела паказваюць свае работы. Сярод маладых пісьменнікаў, якія падаюць надзеі, можна назваць Кацярыну Мізерыю, Аляксандру Кароль, Дзяніса Рабчука, Марыю Бугаеву... Вельмі важна падтрымаць, акрыліць, не загубіць натхненне. Бо сапраўды, падыходзячы да сярэдняга ўзросту, многія паглыбляюцца ў працу, сямейныя справы і на доўгі час развітваюцца з творчасцю.

Брэсцкае абласное аддзяленне штогод праводзіць конкурсы для маладых аўтараў. І мы стараемся заахвоціць дыпломамі як мага больш таленавітых падлеткаў. Вельмі радуе, што свае шчырыя, багатыя на светлыя пачуцці творы да нас дасылаюць не толькі студэнты філалагічных ВНУ, але і будучыя будаўнікі, цырульнікі, кухары. Уяўляеце, як прыемна зазірнуць у душу прадстаўніка прафесіі, далёкай ад лірыкі, у якой нараджаюцца вершы? Іх думкі прасякнуты любоўю да сваёй сям'і, любімай справы, малой радзімы.

Не думаю, што можна кагосьці зрабіць пісьменнікам. Памятаю, як ва ўніверсітэце выцягнула білет з пытаннем «Як напісаць твор?» За адказ атрымала невысокую адзнаку. І зараз упэўнена, што нараджэнне



твора пачынаецца з унутранага гарэння, з любові да жыцця, з трапяткога ўспрымання свету. Як немагчыма будаваць планы ў каханні, так немагчыма і ў творчасці. Натхненне акрыляе адразу, а потым твор доўга шліфуецца...

***— Сумесна з філфакам Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна Брэсцкім абласным аддзяленнем СПБ праводзіўся конкурс «Маладая літаратурная крытыка». Гэта быў адзінкавы выпадак, ці стала традыцыяй?***

Начальная цена продажи – 130 440 руб. (сто тридцать тысяч четыреста сорок рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 13 044 руб. (тринадцать тысяч сорок четыре рубля)

Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г. п. Вороново, ул. Калинина, 4, тел. 8-01594-217-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083322500 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 апреля 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 15 апреля 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1:

- капитальное строение с инвентарным номером 441/С-14676 (назначение – здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака, наименование – здание колбасного цеха), площадь – 409,9 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 41/7,
- капитальное строение с инвентарным номером 441/С-16125, (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – здание гаражей), площадь – 83,3 кв. м, расположенного по адресу: Гродненская обл., Ивьевский р-н, г. Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 47, корп. 1

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 422950100001002959, находящемся по адресу: Гродненская обл., Ивье, ул. 50 лет Октября, д. 41, площадь – 0,3784 га, целевое назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания колбасного цеха.
Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель. Виды ограничений (обременений) прав: земельные участки, расположенные на территорий, подвергшейся радиационному загрязнению (зона) проживания с периодическим радиационным контролем), код – 3,5, площадь – 0,3784 га, земельные участки, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0344 га; земельные участки, находящиеся в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0618 га

Начальная цена продажи – 87 120 руб. (восемьдесят семь тысяч сто двадцать рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 8 712 руб. (восемь тысяч семьсот двенадцать рублей)

Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г. п. Вороново, ул. Калинина, 4, тел. 8-01594-217-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB3012050083322 5001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 19 апреля 2022 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 208**

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18**

**Последний день приема заявлений – 15 апреля 2022 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ГЛХУ «Смолевичский лесхоз», Минская область, г. Смолевичи, ул. Первомайская, 72а** |

**Предмет аукциона: транспортное средство, бывшее в употреблении**

| Лот № | Инв. номер | Наименование | Начальная цена, с НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 01321421 | **Машина лесная погрузочно-транспортная Белорус МПТ-461.1,** гос. номер ОВ-5 3812, 2008 г. в. Месторасположение: Минская обл., Смолевичский р-н, п. Усяж | **19 320,00** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки». Срок внесения задатка по **07.04.2022**

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденном постановлением Совета Министров РБ от 12 июля 2013 г. № 609 (далее – Положение)

**Дата и время проведения аукциона:**
**11.04.2022 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
**Дата и время окончания приема документов:**
**07.04.2022 до 17.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Контактные телефоны**: +375 (17) 280-36-37; +375 (44) 704-92-06.
**E-mail:** auction@cpo.by

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту: «Многоквартирный жилой дом с подземной автостоянкой и встроенными объектами обслуживания в границах ул. Пригородной, Гая»

**Сведения о застройщике**

1. Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190580566. Юридический адрес: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

- усадебные жилые дома №№ 1, 7, 9, 11 по ул. Лапоровичской, №№ 20, 22 по ул. Пильницкой,
- блокированные жилые дома №№ 2, 4, 7, 12, 14, 16 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства – 36 месяцев,
- квартира № 1 в блокированном доме № 6 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства – 39 месяцев,
- квартира № 2 в блокированном доме № 6 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства – 48 месяцев,
- блокированные жилые дома №№ 1, 3, 5, 8, 10, 16 по ул. Пильницкой – фактический срок строительства – 48 месяцев,
- «Строительство многоквартирных жилых домов в границах квартала № 2 пос. Восточный в г. Минске» – фактический срок строительства – 15 месяцев.

2. Цель строительства объекта «Многоквартирный жилой дом с подземной автостоянкой и встроенными объектами обслуживания в границах ул. Пригородной, Гая» (далее – объект), общей площадью жилых помещений 8065,28 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем.

Строительство осуществляется за счет средств физических лиц.

Начало строительства объекта – 15 апреля 2020.

Предполагаемый срок приемки в эксплуатацию объекта – сентябрь 2022.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» от 21.08.2019 № 455-15/19, от 29.01.2020 № 838-15/19 (дополнение), от 10.08.2020 № 402-15/20.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решениями Мингорисполкома от 19.09.2019 № 2895, от 13.02.2020 № 407, от 28.12.2020 № 4110. Свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации № 500/849-9823, № 500/1802-2006.

Извещение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 14.04.2020 № 03/132 о регистрации объекта.

Генеральный подрядчик – ОАО «Стройтрест № 35» (договор строительства объекта № 301 от 03.04.2020).

В коммунальную собственность г. Минска безвозмездно передается 3,8 % с общей площади жилых помещений объекта, за исключением общей площади жилых помещений, строящихся за счет средств республиканского и (или) местных бюджетов, а также для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий (за исключением граждан, признанных нуждающимися в улучшении жилищных условий по дополнительным основаниям, предусмотренным организациями в коллективных договорах), но не менее общей площади жилых помещений коммунальной собственности, использованных для отселения граждан из подлежащих сносу жилых домов с площадки строительства объекта.

Проектируемый жилой дом расположен в квартале индивидуальной жилой застройки.

Участок в границах работ площадью 1,174 га расположен в Центральном районе г. Минска. С севера участок ограничен Земледельческим переулком с перспективой расширения ул. Пригородной по утвержденному детальному плану, с юга – жилой многоквартирной застройкой, с запада – жилой усадебной застройкой, с востока – разворотным кольцом ДП «Карастояновой».

Жилой дом запроектирован 10-этажным 3-секционным со встроенными помещениями административно-торгового назначения и одноуровневой подземной автостоянкой, с совмещенной плоской кровлей с внутренним водостоком. Здание запроектировано в монолитном железобетонном каркасе.

В качестве наружных ограждающих конструкций приняты блоки из ячеистого бетона, устанавливаемые поэтажно на перекрытия с лицевой отделкой системой «вентилируемый фасад» с металлическим кассетами, с утеплением бетонных конструкции минераловатными плитами.

В подземном уровне размещены: автостоянка для хранения автомобилей на 94 машино-места, технические и служебные помещения.

На первом этаже жилого дома предусмотрены входы в секции жилого дома, расположены встроенные помещения административного и административно-торгового назначения с автономными входами со стороны проезда (всего 8 блоков) и помещения для технического обслуживания и эксплуатации здания, колясочная, помещение диспетчера, кладовые уборочного инвентаря.

На эксплуатируемой кровле подземной одноуровневой автостоянки организована внутренняя озелененная дворовая территория с набором детских игровых площадок и площадок для хозяйственно бытовых нужд.

Конструктивная схема здания предполагает возможность свободной планировки внутри отдельной квартиры.

Всего в жилом доме запроектировано 141 квартира:
- однокомнатных – 86 (в т. ч. 26 квартир-студий);
- двухкомнатных – 20;
- трехкомнатных – 35.

Все квартиры жилого дома имеют летние помещения.

В проектируемом здании предусмотрено 6 лифтов. Здание выполнено с учетом обеспечения доступа в квартиры маломобильных групп населения.

Конструкция окон и балконных дверей – из профиля ПВХ с заполнением двухкамерным стеклопакетом.

Остекление лоджий – из алюминиевого профиля с одинарным остеклением или в квартирах с единственной инсолируемой комнатой – экранное ограждение из многослойного безопасного стекла.

В состав общего имущества по объекту входят: лестничные клетки, лестницы, лифт, лифтовые и иные шахты, коридор, крыша, чердак и подвалы, другие места общего пользования, несущие ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящиеся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т. ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Долевое строительство данного объекта осуществляется в соответствии с нормами Указа Президента Республики Беларусь от 06.06.2013 № 263 «О долевом строительстве объектов в Республике Беларусь».

**3. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для физических и юридических лиц предлагается 7 помещений административного и административно-торгового назначения общей площадью от 41,65 до 58,56 кв. метра.**

4. Стоимость 1 $м^2$ – сумма в белорусских рублях равная **4 279,52** (четыре тысячи двести семьдесят девять рублей 52 копейки), что эквивалентно 1 300 долларам США по курсу Национального банка Республики Беларусь на 14.03.2022 (3,2916).

**Стоимость квадратного метра административных и административно-торговых помещений сформирована без учета затрат застройщика, не включенных в сводный сметный расчет стоимости строительства объекта долевого строительства, но относимых на стоимость строительства. Данные затраты будут предъявлены дольщику по окончании строительства с заключением дополнительного соглашения.**

**5. Условия оплаты. Обязательство дольщика по уплате цены объекта долевого строительства (цены договора) исполняется в белорусских рублях в сумме, эквивалентной определенной сумме в долларах США** по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному Национальным банком на **14.03.2022** – 3,2916 руб – на специальный и расчетный счета застройщика. Оплата по договору производится по графику платежей – первоначальный взнос в размере, установленном графиком платежей, являющимся приложением к договору долевого строительства, в течение 15 (пятнадцати) календарных дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.

**6. Для подачи заявления и заключения договора необходимо:**

- личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор, или его представителя;
- паспорт (+копия паспорта) или доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке;
- копия свидетельства о государственной регистрации, документ, подтверждающий полномочия на представление интересов, копия Устава (для юридического лица).

7. Документы для заключения договоров будут приниматься с **25 марта 2022 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Прием заявлений осуществляется до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству продекларированных помещений.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел.: (017) 251-07-26, +375 29 311 15 15.**

**Пункты 3.3, 5.2, 6.2 проектной декларации, опубликованной в газете «Звязда» от 20.08.2021 № 159 (29528) считать утратившими силу с даты опубликования настоящей декларации.**

# ШАЛЁНЫЯ «БАКСЫ»



## Чаму да долара няма даверу

**Захоўваць свае зберажэнні ў доларах нявыгадна і нават небяспечна. Бо такім чынам можна падвергнуцца наступствам інфляцыі. Пра гэта заявіў амерыканскі мультымільярдэр і вынаходнік, уладальнік кампаній SpaceX і Tesla Ілан Маск у сваім паведамленні ў Twitter. Як вядома, сёлета ЗША захліснула рэкорднае «цунамі» інфляцыі. Рэзкі рост цэн прывёў да ўзрушэння і палярызацыі грамадства. На фоне такіх падзей Маск патлумачыў, што долар канчаткова страціў давер — амерыканская валюта вельмі ненадзейная. У гэтай сітуацыі «лепш мець фізічныя рэчы, напрыклад дом, або акцыі кампаній, якія, на вашу думку, робяць добрыя прадукты», растлумачыў бізнесмен. У глабальным кантэксце «бакс» можа страціць свае пазіцыі галоўнай сусветнай валюты з-за інфляцыі, абмежавальных мер у адрас Расіі і сітуацыі на рынках, заявіў эканаміст, прафесар Тэхнічнага ўніверсітэта Дортмунда Хенрык Мюлер у калонцы для Spiegel. Чаму да долара няма даверу?**

### ЗАЛАТЫ СТАНДАРТ

У ліпені 1944-га ў багата ўбранай бальнай зале на курорце ў Нью-Гэмпшыры сабраліся 730 дэлегатаў з 44 дзяржаў, удзельнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. Падзея ўвайшла ў гісторыю як Брэтан-Вудская канферэнцыя. У выніку была распрацавана новая манетарная сістэма. У яе аснове — глабальная канцэпцыя, якая паставіла сусветныя валюты ў залежнасць ад амерыканскага долара. Дэкларавалася, што яго заўсёды можна будзе абмяняць на золата, якое захоўваецца ў ЗША.

У самым пачатку канферэнцыі тады яшчэ малавядомым брытанскім эканамістам Джонам Мейнардам Кейнсам у якасці альтэрнатывы была прапанавана штучная валюта банкор (bancor). Згодна з агучанай канцэпцыяй яго курс павінен быў вызначацца ў адносінах да золата, а курсы ўсіх сусветных валют вылічваліся б у банкорах. Таксама Кейнс прапанаваў стварыць Міжнародны разліковы саюз, праз які павінны былі рэгулявацца ўзаемныя запазычанасці цэнтрабанкаў.

Але гэтыя прапановы былі адрынуты амерыканскай дэлегацыяй, якая выступіла за арыентаваны на ЗША доларазалаты стандарт, у адпаведнасці з якім на працягу наступных амаль трыццаці гадоў суверэнныя валюты мелі розную вагу ў адносінах да долара і абменьваліся (хоць і нячаста) самімі ўрадамі на рэальнае золата па курсе $35 за унцыю. Але, на думку многіх эканамістаў, ужо ў той час адпаведная прывязка была дастаткова слабая.

Гэтая праблема дасягнула свайго апагею, калі амерыканская адміністрацыя выдаткавала вялізныя сродкі на праграму «Вялікае грамадства» прэзідэнта Ліндана Джонсана і на вайну ў В'етнаме. Пасля такіх крокаў Вашынгтона дзяржавы пачалі сумнявацца ў надзейнасці абяцанняў Штатаў абменьваць валюту на золата па іх патрабаванні. Тады ўпершыню на гарызонце замаячыў прывід амерыканскага дэфолту, адзначыў plusworld.ru.

У лютым 1965-га прэзідэнт Францыі Шарль дэ Голь прама заявіў аб намеры кінуць выклік долараваму дамінаванню. Ён падкрэсліў, што не можа ўявіць ніякага іншага стандарту для грашовай сістэмы, акрамя золата. Пасля гэтага Францыя адправіла ў ЗША лінкор з доларамі, каб забраць свае зберажэнні ў каштоўным метале. Вашынгтон у выніку быў вымушаны выканаць свае абавязанні. Гэты абмен заняў амаль цэлы год.

### У ЗВЯЗЦЫ З НАФТАЙ

У 1971 годзе прэзідэнт Рычард Ніксан абвясціў аб адмене залатога забеспячэння долара, заявіўшы, што ЗША больш не будуць выконваць адпаведную прывязку нацыянальнай валюты. Пасля настала дзесяцігоддзе разбуральнай для амерыканскай эканомікі інфляцыі, і на працягу 1970-х была цалкам ліквідавана ўся Брэтан-Вудская грашовая сістэма.

ЗША змаглі стабілізаваць долар толькі за кошт рэзкага павышэння ставак у спалучэнні з вынаходлівай «схемай нафтадолара». Гэтаму дапамог ваенна-эканамічны саюз амерыканцаў з Саудаўскай Аравіяй, у якім ЗША гарантавалі саудаўцам ваенную абарону ў абмен на выключнае доларавае нафтавае цэнаўтварэнне ў спалучэнні з пераразмеркаваннем прыбытку ў казначэйскія аблігацыі



ЗША. Шмат у чым дзякуючы гэтай схеме ў свеце на нейкі час была адноўлена вера ў долар, згубленая ў выніку дэфолту Ніксана.

Іншыя інструменты таксама паспрыялі ўмацаванню «бакса» на замежных рынках. Так, ЗША перанакіравалі свой «танны» знешні доўг на ваенныя выдаткі і абвясцілі сябе гарантам, які забяспечвае сусветную энергетычную і харчовую бяспеку, абараняючы гандлёвыя шляхі з дапамогай свайго ваенна-марскога флоту. Таксама ўстанаўленню Вашынгтонам сваіх правілаў дапамагло тое, што яны ўзялі пад кантроль такія міжнародныя фінансавыя інстытуты, як Міжнародны валютны фонд (МВФ), які выкарыстоўваецца для кароткатэрміновага крэдытавання ўрадаў розных краін, і Сусветны банк — для доўгатэрміновага фінансавання праектаў развіцця. Акрамя таго, Злучаныя Штаты дазволілі сваім рынкам каштоўных папер стаць глабальнай скарбонкай для ўкладчыкаў па ўсім свеце.

Сёння памер каштоўных папер, якія публічна гандлююцца ў ЗША, значна перавышае іх долю ў сусветным валавым унутраным прадукце. Паводле даных Finbold, летась на Злучаныя Штаты прыпадала больш за палову адноснага аб'ёму сусветнага фондавага рынку. Для разумення гэтага дамінавання можна прывесці параўнанне з Японіяй, якая займае другое месца ў свеце і кантралюе ўсяго 7,4 працэнта. У доларах ЗША праводзіцца таксама большая частка міжнародных гандлёвых аперацый за межамі краіны.

Казначэйскія аблігацыі Штатаў пачалі лічыцца глабальным безрызыковым ашчадным інструментам для суверэнных дзяржаў. Такім чынам, і ў адсутнасць прывязкі да золата долар квітнеў як дамінантны сродак міжнародных разлікаў. Аднак бліжэй да 2014-га ўсё змянілася. Купля замежнымі дзяржавамі пазык Вашынгтона пачала стагніраваць. Нягледзячы на тое, што ў 2018-м замежныя пакупкі казначэйскіх аблігацый узраслі, яны нават блізка не паспявалі за шалёным ростам дзярждоўгу ЗША.

Замежныя дзяржавы, якія доўгі час падтрымлівалі статут Штатаў, ахвотна купляючы іх доўг, набывалі ўсё менш і менш новых абавязкаў, пазіраючы на неадэкватныя дзеянні амерыканскага кіраўніцтва на знешняй арэне, заўважыў plusworld.ru. У выніку доля замежнай уласнасці ў даўгу ЗША зменшылася з 34 працэнтаў у 2015-м да 24 працэнтаў напрыканцы мінулага года.

У 2015-м тагачасны прэзідэнт ЗША Барак Абама выступіў з папярэджаннем аб небяспецы для доларавай сістэмы (у кантэксце аднабаковых абмежаванняў супраць Ірана), якую могуць прадстаўляць адвольныя санкцыі. «Мы не можам дыктаваць знешнюю, эканамічную і энергетычную палітыку кожнай буйной дзяржаве свету. Нам прыйшлося б адрэзаць такія краіны, як Кітай, ад амерыканскай фінансавай сістэмы. А паколькі яны з'яўляюцца найбуйнейшымі пакупнікамі нашага доўгу, такія дзеянні могуць выклікаць сур'ёзныя збоі ў нашай уласнай эканоміцы і, дарэчы, узняць міжнародныя пытанні аб ролі долара як сусветнай рэзервовай валюты», — заявіў Барак Абама.

### ЧАС ЮАНЯ

Цяперашні прэзідэнт Джо Байдэн не пачуў папярэджання свайго колішняга боса. Спачатку ЗША захапілі актывы афганскага цэнтральнага банка, якія захоўваліся ў Нью-Ёрку. Не задаволіўшыся гэтым, Байдэн абрынуў на Расію фінансавую «ядзерную бомбу», захапіўшы ўсе замежныя рэзервы Цэнтрабанка РФ. Як адзначаюць эксперты,



вынікам такіх дзеянняў з'яўляецца поўны падрыў даверу да амерыканскай валюты.

Заснавальнік Mobius Capital Partners Марк Мобіус заявіў, кітайскі юань зрушыць долар і зойме месца асноўнай рэзервовай валюты. Фінансіст растлумачыў, што ў юаня больш за ўсё шанцаў, таму што залатыя рэзервы краіны пастаянна растуць. «Кітайскі юань на сёння, мабыць, самая перспектыўная валюта ў свеце. Яна рэальна ўжо цяпер мацнейшая, чым долар ЗША. Думаю, юань у найбліжэйшыя гады ператворыцца ў ключавую валюту, таму што эканамічная моц Кітая па аб'ёмах вытворчасці ў рэальным сектары эканомікі пераўзыходзіць эканамічную моц ЗША і Еўрасаюза. КНР вырабляе больш за палову стальнога пракату на планеце, кожны трэці аўтамабіль, рознае абсталяванне. Тое, што Беларусь, Расія і краіны Усходу будуць абапірацца на кітайскі юань, абсалютна правільна», — адзначыў БелТА эканаміст, магістр палітычных навук, выкладчык Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Віктар Саевіч. Як вядома, з 18 сакавіка ў гандлёвай сістэме ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа» з'явілася магчымасць ажыццяўлення аперацый з кітайскай валютай.

Днямі стала вядома, што Саудаўская Аравія абмяркоўвае з Паднябеснай магчымасць продажу нафты за юані замест долараў, піша WSJ. Перагаворы, па звестках газеты, выкліканы разладам у адносінах паміж Эр-Рыядам і Вашынгтонам. Продаж Кітаю нафты за юані, паводле інфармацыі крыніц, можа аслабіць пазіцыі долара на сусветным рынку нафты, а таксама падтрымаць курс кітайскай валюты. У той жа час, на думку экспертаў, апытаных выданнем, такое рашэнне можа прывесці і да паслаблення саудаўскага рэала. На фоне гэтых паведамленняў юань падскочыў да максімуму, адзначае Bloomberg са спасылкай на інфармацыю Dow Jones.

Як вядома, на мінулым тыдні лідары ААЭ і Саудаўскай Аравіі адмовіліся абмяркоўваць з Байдэнам нарошчванне нафтаздабычы. Як адзначае WSJ, пасля таго, як два лідары блізкаўсходніх краін адмовіліся размаўляць з кіраўніком Белага дома, яны правялі тэлефонныя перагаворы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.

### НОВЫЯ ЦЭНТРЫ

Цяперашняя сітуацыя змяняе расклад сіл, прыводзячы да ўтварэння і ўзмацнення новых блокаў з суверэнных краін з фрагментаванымі фінансавымі рынкамі ўзамен глабальных фінінстытутаў, якія прасоўвае ЗША, падкрэсліў прафесар Хенрык Мюлер. «Ядзерныя» санкцыі Захаду стратэгічна наблізяць крах амерыканацэнтрычнай валютнай сістэмы. Яна пакуль не развальваецца, але крышыцца. Трэснула, як люстэрка, якое ўпала. Напэўна, ужо цяпер цэнтральныя банкі па ўсім свеце пераглядаюць рызыкі ўкладанняў у долары і еўра», — мяркуе першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Эксперт» Аляксандр Івантэр. Ён лічыць, што варта «павялічваць долю разлікаў у гандлі з краінамі за перыметрам санкцый у нацыянальных валютах. Толькі калі раней гэта быў амаль акадэмічны пасыл, доўгатэрміновая мэта, то цяпер гэта імператыў практыкі».

У пачатку лютага прэзідэнт РФ Уладзімір Пуцін на перагаворах са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам абмеркаваў пашырэнне ўзаемных разлікаў у нацыянальных валютах. Зараз на долю такіх разлікаў у двухбаковым тавараабароце прыпадае ўжо больш за 20 працэнтаў. У пачатку гэтага тыдня правялі перагаворы ўрадавыя дэлегацыі Беларусі і Расіі. Сярод рашэнняў, якія прыняты па выніках сустрэчы, — адмова ад долара ў разліках за энергарэсурсы. Цяпер яны будуць рабіцца ў расійскіх рублях.

На месца аднапалярнай мадэлі сусветнай эканомікі, дзе пануюць ЗША, прыходзіць шматпалярная, лічыць турэцкі аналітык Мехмет Алі Гюлер. Свой прагноз ён агучыў у газеце Cumhuriyet. «Інстытуты старога ліберальнага парадку, такія як адзіная валюта (долар), адзіны банк (Сусветны банк), адзіная фінансавая ўстанова (МВФ), адзіная банкаўская сістэма (SWIFT), зменяцца, калі ў гэтых інстытутах павысіцца вага новых цэнтраў, прычым новыя цэнтры стварыць альтэрнатывы гэтым інстытутам», — перакананы Гюлер. На яго думку, гэта будзе не адзіная змена ў расстаноўцы сіл на сусветнай арэне. Вашынгтону давядзецца змірыцца са стратай дамінавання.

**Захар БУРАК.**

### ДАСЛОЎНА

### «Будзем хутка змагацца, каб лішні расійскі рубель быў у кішэні ці юань»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што ў перспектыве на валютным рынку Беларусі будуць больш запатрабаваны расійскія рублі і юані, таму што менавіта Расія і Кітай выступаюць у якасці асноўных гандлёвых партнёраў краіны.

Таму ў цяперашнім становішчы Аляксандр Лукашэнка раіць людзям не «бегаць па «завугольлі», каб дзесьці набыць долары. «Ну, выменялі, нахапаліся. Цяпер гэты долар ужо пацыху пачынае асядаць. Бо нікому не патрэбны. Асабліва ў сувязі з гэтымі санкцыямі, якія ўведзены супраць нас», — канстатаваў ён.

«Напэўна, будзем хутка змагацца, каб лішні расійскі рубель быў у кішэні ці юань. Таму што з гэтымі краінамі мы ў асноўным будзем гандляваць», — заўважыў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка перакананы, што краіна зможа пераадолець санкцыі Захаду, і разлікі замежных сіл на дэстабілізацыю абстаноўкі ў краіне не апраўдаюцца. «Нічога з гэтага не атрымаецца», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Сіла духу

# «Выступаць у камандзе павінны тыя, хто хоча біцца за краіну і за клуб»

**У гісторыю хакейнага клуба «Дынама-Мінск» упісаны чарговы спартыўны сезон — цікавы, насычаны, але вельмі неадназначны. Аднак менавіта гэта і надае яму пэўную непаўторнасць і адметнасць, а таксама новы вопыт. Які мінулы сезон бачыць кіраўніцтва клуба, якія ўрокі вынеслі трэнеры і гульцы і якія планы на будучыню — прадстаўнікі каманды расказалі журналістам.**

## ГАЛОЎНУЮ ЗАДАЧУ ВЫКАНАЛІ

Сёлета «зубры» ў КХЛ спыніліся ў першым раўндзе плэй-оф Кубка Гагарына. Спынілі іх сапернікі са СКА, якія ў заключным матчы абыгралі мінчан з вынікам 4:3. Аднак, па словах генеральнага дырэктара клуба Сяргея Сушко, са сваёй задачай каманда справілася: «У нас была задача мінімум — прайсці ў плэй-оф. Каманда яе выканала. У спорце заўсёды ставяцца максімальныя задачы. У хакеі — гэта Кубак Гагарына, мы да яго не падышлі, таму нам ёсць куды расці. Сезон быў скамечаны, было шмат абмежаванняў, каманда не заўсёды выступала ў поўным саставе. Мы страцілі дзевяць дамашніх гульняў, калі паглядзець на сапернікаў, то сем з іх павінны былі быць нашымі. І месца ў рэгулярным чэмпіянаце мы маглі заняць вышэйшае. Але галоўную задачу каманда выканала. Калі зыходзіць з гэтага, сезон быў нядрэнны, але хацелася б лепш».

**Шмат маладых беларускіх перспектыўных хакеістаў выступае ў лігах Паўночнай Амерыкі. Іх патэнцыял мог бы быць вельмі карысным для «Дынама-Мінск».**

Гэты сезон галоўны трэнер «зуброў» Крэйг Вудкрафт назваў унікальным. Сезон алімпійскі, і таму расклад рэгулярнага чэмпіянату КХЛ атрымаўся вельмі скамечаным. Спачатку «Дынама-Мінск» паказваў добрыя вынікі ў матчах з мацнейшымі камандамі, але потым пачаліся хваробы. З-за гэтага былі моманты, калі не хапала гульцоў. Перад плэй-оф быў перапынак у восем тыдняў. Па словах трэнера, два месяцы рыхтавацца да плэй-оф — гэта нонсэнс. «Я не шкадую аб тым, як прайшоў сезон. Увесь клуб зрабіў вялікую работу. Што датычыцца выніку плэй-оф, канешне, хацелася прайсці далей. Я заўсёды кажу хакеістам, што мы тут, каб перамагаць. І ўсё, што не з'яўляецца перамогай у Кубку Гагарына — незадавальняльны вынік. З гэтага сезона трэба вынесці ўрокі, паглядзець, што варта ўдасканаліць, каб рыхтавацца да наступнага сезона», — сказаў Крэйг Вудкрафт.

Знешніх фактараў, якія ўскладнялі жыццё хакеістам, у гэтым сезоне было сапраўды шмат. Да каранавірусных абмежаванняў усе ўжо прывыклі, але яны змаглі нарабіць сюрпрызаў. З 15 студзеня быў спынены рэгулярны чэмпіянат Кантынентальнай хакейнай лігі. «Зубры» не правялі дзевяць запланаваных гульняў, што, зразумела, не магло не паўплываць на іх вынікі. «Мы вельмі добра выступалі ў снежні і студзені, каманда паказвала добры хакей. І нечакана Ліга спынілася пасля нашай гульні з «Авангардам». Наступныя 53 дні мы не гулялі ўвогуле, у нас была толькі выставачная гульня. Нам вельмі хацелася правесці тыя дзевяць матчаў, сем з іх былі дамашнія. Калі паглядзець на сапернікаў, можна сказаць, што некаторыя з іх абавязкова былі б нашы. І мы маглі б заняць вышэйшае месца ў табліцы, чым ёсць. Тыя гульні нам бы дапамаглі. Адмена рэгулярнага чэмпіянату КХЛ моцна паўплывала на нашы вынікі ў плэй-оф», — расказаў галоўны трэнер «Дынама-Мінск» Крэйг Вудкрафт.

**Знешніх фактараў, якія ўскладнялі жыццё хакеістам, у гэтым сезоне было сапраўды шмат.**




У гэтым сезоне далей у плэй-оф «зуброў» не прапусцілі хакеісты санкт-пецярбургскага СКА. Каманды правялі чатыры матчы, і мацнейшымі ў гэтай серыі аказаліся расійскія хакеісты. Па словах Крэйга Вудкрафта, гэта серыя паказала, што «Дынама-Мінск» можа спаборнічаць з самым моцным сапернікам. Ён падкрэсліў, што 11 з 12 перыядаў серыі праходзілі ў роўнай барацьбе. Выключэннем стаў толькі перыяд матча 2 сакавіка. «Магчыма, нашым хлопцам недзе не хапала заточанасці на перамогу, выканання задання на гульні, былі праблемы з рэалізацыяй сваіх момантаў. Узровень нашых сапернікаў вельмі высокі. Вылучу тры аспекты, у якіх мы саступілі: больш элітны ўзровень спартсменаў, выдатная рэалізацыя і добрыя хуткасці. Нам патрэбна ўдасканальваць гэтыя моманты, каб станавіцца мацнейшымі і лепшымі. Усяму клубу неабходна правесці вялізную працу, каб пераўзысці свой вынік у наступным сезоне. Нам трэба быць адзіным цэлым і бачыць мэты ў развіцці хакеістаў. А ім патрэбна ненавідзець прайграваць і выступаць з агнём у вачах, яны павінны быць галоднымі да перамог. Тады для каманды настануць лепшыя часы. І мы ўжо побач з гэтым», — рэзюмаваў Крэйг Вудкрафт. Ён падкрэсліў, што ўсе цяжкасці, якія выпалі на долю каманды, не варта ўспрымаць негатыўна. Гэта рэальнасць, з якой сутыкнуліся ўсе. І ў ёй былі і добрыя моманты.

## НІ АДЗІН НЕ ВЫПАДАЕ З ПОЛЯ ЗРОКУ

Прагрэс сапраўды можна лічыць пазітыўным момантам. І не проста так. Крэйг Вудкрафт нагадаў, што адна з глабальных мэт клуба «Дынама-Мінск» — развіццё беларускіх хакеістаў, у тым ліку і маладых. Менавіта ў клубе яны могуць прагрэсіраваць, што і робяць ад сезона да сезона. Ілья Усаў і Уладзімір Алістратаў засталіся ў камандзе з мінулага сезона. Па словах галоўнага трэнера, у гэтым сезоне яны палепшылі сваю гульню, сталі праяўляць лідарскія якасці. Аляксей Коласаў добра паказаў сябе ў найбольш напружаных матчах. Для Аляксандра Суворава гэты сезон быў дэбютам у КХЛ. І ў хакеіста былі як узлёты, так і падзенні. Умяшаўся каранавірус, траўмы, свой уплыў аказаў і яго ад'езд на чэмпіянат свету ў саставе маладзёжнай зборнай. Але для першага сезона нядрэнна. Тое самае Крэйг Вудкрафт сказаў і пра Сяргея Сапегу. У сваім дэбютным сезоне ён праявіў сябе як важны гулец на абарончай лініі. Мікіта Пышкайла прыйшоў на дапамогу камандзе, калі шмат хакеістаў хварэла на каранавірус. І паказаў, што можа выступаць на ўзроўні КХЛ. Крэйг Вудкрафт падкрэсліў: у гэтага хакеіста вялікая будучыня, што, безумоўна, вельмі важна для клуба.

А вось запрошаныя хакеісты не ўсе паказалі той вынік, які ад іх чакалі. «Думаю, на іх выступленне паўплывала вельмі шмат знешніх фактараў, пачынаючы з пандэміі і траўмаў і заканчваючы псіхалагічным станам. Таму атрымалася такая гульня, якую мы бачылі. Да таго ж у плэй-оф мы недалічыліся двух майстравітых гульцоў — Лукаса Бенгтсана і Марыё Кемпэ. Разумеем, што Марыё быў не вельмі дзейсны, але яго агульны ўзровень і ўменне трымаць інтэнсіўнасць і шчыльнасць гульні, мабільнасць досыць высокія. Яго траўма стала сур'ёзнай стратай для нас. Калі прайсціся персанальна, дык так, некаторыя замежнікі не паказалі свайго максімуму. На мой суб'ектыўны погляд, менш за ўсё прэтэнзій можа быць да Антона Ліндхольма, які па вялікім рахунку праявіў сябе лепш за ўсіх легіянераў», — расказаў вядучы спецыяліст па селекцыі клуба Андрэй Парфімовіч.

Хто з гульцоў застанецца ў складзе каманды на наступны сезон, пакуль сказаць цяжка. Як падкрэсліў Сяргей Сушко, працэс селекцыі хакеістаў ідзе круглы год. Гульцы з двухгадовымі кантрактамі ў саставе застануцца. «Які будзе састаў на наступны сезон? Гэта пакажа найбліжэйшая будучыня. Мы ўсе жывём у сучасным свеце, загадваць тут складана. Невядома, што далей, якая будзе сітуацыя з легіянерамі. Усюды дэкларуецца, што спорт па-за палітыкай. Але, як правіла, атрымліваецца наадварот. Таму не ўсё залежыць ад нас. Усе клубы КХЛ, у прыватнасці «Дынама», цалкам выконваць свае абавязкі перад замежнымі хакеістамі. Але часам бываюць прычыны, якія індывідуальныя для кожнага. Адштурхоўваемся ад таго, што будзе адбывацца далей, а не загадваем зараз», — падкрэсліў генеральны дырэктар клуба.

Шмат маладых беларускіх перспектыўных хакеістаў выступае ў лігах Паўночнай Амерыкі. Іх патэнцыял мог бы быць вельмі карысным для «Дынама-Мінск». Калі яны захочуць выступаць пад яго эмблемай, канешне. Сёння ўсе гэтыя гульцы знаходзяцца пад увагай селекцыйнага аддзела «Дынама-Мінск». «Калі хтосьці з хлопцаў будзе вольны ці знойдзем кампраміснае рашэнне, якое задаволіць абодва клубы і гульца, тады, вядома, паспрабуем вярнуць хакеістаў, што гараць жаданнем выступаць за наш клуб у КХЛ і годна яго прадстаўляць», — заявіў Сяргей Сушко. Але галоўнае — выканаць усе ўмовы і дзейнічаць толькі згодна з кантрактамі. «Мы хацелі б, каб Данііл Клімовіч гуляў у нас, але тут нашага жадання мала. Некалькі месяцаў таму мы радаваліся яго высокаму нумару драфту НХЛ. Ён з'ехаў у Паўночную Амерыку і адразу падпісаў шматгадовы кантракт пачаткоўца з адным з найстарэйшых клубаў. Гэта дарагога варта. Калі ў «Ванкувера» паўстане жаданне, каб Клімовіч атрымаў практыку ў КХЛ, дык, пэўна, ён выступіць за мінскае «Дынама». У нас замацаваны правы на хакеіста ў лізе», — дадаў генеральны дырэктар клуба.

Каб хакеіст апынуўся ў складзе «Дынама-Мінск», павінна супасці шмат фактараў. Першым з іх Сяргей Сушко назваў жаданне самога гульца. Выступаць у камандзе павінны тыя, хто хоча біцца за краіну і за клуб. Ён прывёў у прыклад Васіля Філяева, які хоча развівацца ў «Аўтамабілісце» з Екацярынбурга. Зразумела, што ў тым ці іншым гульцы павінен быць зацікаўлены і трэнерскі штаб. І калі жаданне ўсіх бакоў супадае, гулец аказваецца сярод «зуброў».

«Ні адзін малады гулец не выпадае з поля зроку селекцыйнай службы. Мы актыўна сочым за ўсімі. У нас не так шмат хакеістаў, каб раскідвацца імі. Самае галоўнае, каб нашы хлопцы гулялі. Наша асноўная задача — стварыць усе ўмовы і такі мікраклімат, каб хакеісты з гонарам прыязджалі ў нашу зборную і абаранялі гонар краіны на міжнароднай арэне», — заявіў Сяргей Сушко.

## ЭКЗАМЕН ДЛЯ ТРЭНЕРАЎ

Кожны сезон — праверка сіл не толькі для спартсменаў, але і для трэнераў. У гэтым сезоне пост асістэнта галоўнага трэнера пакінуў вядомы хакеіст Міхаіл Грабоўскі. Яго абавязкі размеркавалі паміж сабой астатнія спецыялісты, вялікую нагрузку ўзяў на сябе Андрэй Мезін. Ён актыўна працаваў з нападаючымі. Галоўны трэнер Крэйг Вудкрафт высока ацаніў работу сваіх маладых калег Дзмітрыя Астапенкі, Дзмітрыя Філіповіча і Аляксея Дашкевіча, якія толькі ў гэтым сезоне сталі працаваць з камандай. «Я хачу сказаць вялікі дзякуй нашаму трэнерскаму саставу, які ў гэты няпросты сезон вельмі добра сябе паказаў. Тры новыя трэнеры выдатна сябе праявілі. Яны заўсёды былі гатовыя працаваць, шмат чаму вучыліся і паспяхова выбудоўвалі зносіны з гульцамі. Яны шмат зрабілі для нас усіх. Для мяне самае важнае, калі трэнеры прыходзяць на работу, гатовыя рабіць усё, каб дапамагчы камандзе быць лепш», — падзяліўся галоўны трэнер.

**Усяму клубу неабходна правесці вялізную працу, каб пераўзысці свой вынік у наступным сезоне.**

Дарэчы, Крэйг Вудкрафт, які працуе з камандай з 2016 года, застаецца на наступны сезон. Ён сам прызнаўся, што жадае гэтага і што ў яго вялікія планы. Акрамя таго, спецыяліст і мінскі клуб звязаныя доўгатэрміновым кантрактам. «Сёлета была адна ўмова — прайсці ў плэй-оф, яна выканана. Таму працяг кантракта — пытанне аўтаматычнае. І мне хацелася б адзначыць галоўнае. У Крэйга вялізнае жаданне застацца ў нашай краіне, прыносіць карысць мінскаму «Дынама». Акрамя таго, што ён трэнер нашага клуба, яшчэ і трэнер зборнай. Крэйг тут не часова, у яго планы працаваць на карысць беларускага хакея», — расказаў Сяргей Сушко.

У канадскага спецыяліста яшчэ адна задача: перадаць свае веды маладым спецыялістам. Па словах кіраўніцтва клуба, менавіта на пераемнасці пакаленняў і перадачы вопыту і навыкаў і будуецца работа ў клубе. Магчыма, у гэтым і заключаецца сакрэт «Зуброў».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Фота ХК «Дынама-Мінск».**

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА»

**филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С., извещает о проведении 31 марта 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 50 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

**ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТы №№ 1–5, 7, 9–11, 16, 18–22, 24–26, 28, 29, 33, 35, 45, 46, 48, 49, 50) размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»**

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», 247210, Гомельская область, г. Жлобин, ул. Школьная, 8. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович. Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в российских рублях (RUB) – ПАО Сбербанк г. Москва, БИК 044525225 , к/с 30101810400000000225 в ГУ Банка России по ЦФО, ИНН 7707083893. К/с 30111810800000000154, БИК BLBBBY2X, ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 марта 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 29 марта 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 24.09.2021 г. № 184 (29553).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона, полный список имущества с ценами и размером задатка по лотам размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 21 апреля 2022 года проводит 8-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 84 | Вертолет Ми-8МТ, № 93275, 1982 г., 4 кат., 3325 часов, 2 КВР-2003 г. | г. п. Мачулищи, в/ч 06752 | 500 000,00 | 100 000,00 |
| 85 | Гусеничный тягач АТС-59Г ш. 11411443 д. 7АЕ0714Е 1985 г. 4 кат. 2368 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 86 | Гусеничный эвакотягач ГЭТ-С, з.н. Е08TN795, 1987 г. в составе: гусеничный тягач АТС-59Г, ш. 11431453, дв. 7AG0752E, 1987 г., 4 кат., 2340 км; специальное оборудование ГЭТ-С (ТГ-4), № 350, 1987 г., 4 кат. | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 25 000,00 | 5 000,00 |
